ISSN1995-0322. СОЦІУМ. Альманах соціальної історії. Випуск 10. – С. 246–288

УДК 347.62+173:94(476)”15”

*Наталля Сліж*

# ШЛЮБНЫЯ І ПАЗАШЛЮБНЫЯ СТАСУНКІ ШЛЯХТЫ Ў ЗВЫЧАЁВЫМ ПРАВЕ І ЗАКАНАДАЎЧЫХ АКТАХ ВКЛ

Тэматыка шлюбных дачыненняў шляхты Вялікага Княства Літоўскага закранaлася ў беларускай, літоўскай, польскай, расійскай гістарыяграфіях XIX–XXI ст. Упершыню да гэтага накірунку звярнуліся даследчыкі Арэст Лявіцкій[1], Міхаіл Уладзімірскі-Буданаў[2], Іван Лапа[3], Мацвеей Любаўскі[4], Уладзімір Спасовіч[5], Іван Скіцкі[6], Ігнацый Даніловіч[7], Тадэўш Чацкі[8]. У XX ст. значны ўнёсак у вывучэнне розных аспектаў шлюбных стасункаў зрабілі Станісловас Лазутка, Ірэна Валіканітэ[9], Вітаўтас Андруліс[10], Ульрых Эрнст[11], Аксіння Таўталес[12],

[1] *Левицький О.* Сім'я і побут українців у XVI ст. // На переломі. Друга половина XVI ст. – К., 1994. – С. 190–295.

[2] *Владимирский-Буданов М.Ф.* Черты семейного права Западной России в половине XVI в. // Чтение в историческом обществе Нестора Летописца. – Киев, 1890. – Кн. 4. Отд. 2. – С. 42–78.

[3] *Лаппо И.И.* Великое княжество Литовское от заключения унии до смерти Стефана Батория (1569–1586). Т. І. – СПб, 1901. – С. 251–252, 478, 519–522.

[4] *Любавский М.* Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского Статута. – М., 1892. – С. 572–581.

[5] *Спасович В.Д.* Об отношениях супругов по имуществу по древнему польскому праву // Сочинения Спасовича В.Д. – Т. 3. – СПб., 1890. – С. 147–160.

[6] *Скитский И.И.* Невенованые вдовы по Литовскому Статуту и по толкованию Сената // Журнал Министерства Юстиции. 1907. – № 7, сентябрь. – С. 19–64.

[7] *Данилович И.* Взгляд на литовское законодательство и литовские Статуты // Юридические записки, издаваемые П. Редкиным. – Т. 1. – М., 1841. – С. 1–46.

[8] *Czacki T.* O litewskich i polskich prawach, o ich duchu, źródłach, związku, i o rzeczach zawartych w pierwszym Statucie dla Litwy, 1529 roku wydanym. – T. 2. – Kraków, 1861. – S. 1–22.

[9] *Лазутка С., Валиконите И.* Имущественное положение женщины (матери, жены, дочери, сестры) привелигированного сословия по I Литовскому Статуту // Научные труды высших учебных заведений Литовской ССР. История. XVI. – Вып. 2. – Вильнюс, 1976. – С. 74–102; *Valikonytė I.* The Venets of Noblewomen in the Grand Duchy of Lithuania // Lithuanian Historian Studies. 1997. – Vol. 2. – P. 97–107; *Валиконите И.М.* I Литовский Статут – один из важнейших источников истории положения женщин в Великом Княжестве Литовском // Первый Литовский Статут 1529 г. – Вильнюс, 1982. – С. 38–46; *Ее же.* Социально-экономическое и правовое положение женщин в Великом княжестве Литовском (конец XV – первая половина XVI в.) и его отражение в первом литовском Статуте. – Вильнюс, 1978. Рукопись на соискание степени кандидата исторических наук // Аддзел рукапісаў Бібліятэкі Віленскага Універсітэту. – Ф. 76. – Спр. 2276.

© Наталля Сліж, 2013

Галіна Дзербіна[13]. Аднак, тым не менш, патрабуецца больш дэталёвае вывучэнне інстытуту шлюбу ў галіне права ў дастатутны перыяд і афармленне ў Статутах 1529, 1566 і 1588 гг.

**Інстытут шлюбу ў дастатутны перыяд**

Сямейнае права ахоплівае разнастайнае кола пытанняў, звязаных з рэгуляваннем адносінаў у сям'і. Да гэтага накірунку таксама адносяцца шлюбныя і пазашлюбныя дачыненні. Да ўвядзення ў дзеянне Статутаў ВКЛ яны рэгуляваліся звычаёвым правам, агульназемскімі і земскімі прывілеямі, судовай практыкай. З іх найбольшы ўплыў, канечне, мела звычаёвае права.

*Звычаёвае права* складаецца з сістэмы няпісаных прававых нормаў, а пазней становіцца асновай для пісанага права[14]. Звычай меў важнае значэнне для традыцыйных грамадстваў, асабліва на пачатку іх фарміравання[15]. У ВКЛ «звычай старадаўні» з'яўляўся крыніцай і формай развіцця права[16]. У рэгуляванні сямейна-шлюбных дачыненняў звычаёвае права захавала свой уплыў нават пасля прыняцця Статутаў.

Найбольш складанае пытанне – гэта крыніцы звычаю[17]: адкуль ён паходзіць, чаму ўзнік? Паходжанне звычаю, які пазней стаў прававой нормай, абмяркоўваўся ў розных працах. Шэрагам даследчыкаў сцвярджалася, што Руская Праўда была вядома ў ВКЛ у XIV–XV стст.[18] Яна стала асновай звычаёвага права ВКЛ і была непасрэдна звязана са Статутам 1529 г.[19] Уладзімір Пічэта дадаткова адзначаў пра істотную ролю прывілеяў і судовай практыкі пры складанні

[10] Істотным недахопам працы Вітаўтаса Андруліса з'яўляццца адсутнасць параўнання заканадаўчых нормаў з практыкай. *Andriulis V.* Lietuvos Statutų (1529, 1566, 1588 m.) šeimos teisė. – Vilnius, 2003.

[11] *Ulrich E.* Eheauflösung im multikonfessionellen Staat der frühen Neuzeit. Kapitel 5 Artikel 20 des Dritten Statuts des Großfürstentums Litauen von 1588. Рэжым доступу: http://www.forhistiur.de/zitat/0510ernst.htm

[12] Праца А. Таўталес за 1929 г. была перадрукавана ў: *Таўталес А.* Права сямейнае паводле Літоўскіх Статутаў // Arche пачатак. – 2009. – № 7. Жнівень. – С. 989–1021.

[13] *Дзербіна Г.* Права і сям'я эпохі Рэнесансу. – Мн., 1997.

[14] *Юхо Я.* Звычаёвае права // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 3. – Мінск, 1996. – С. 433.

[15] *Bloch M.* Społeczeństwo feudalne / Tłum. E. Bąkowska, wst. A. Grabski. – Warszawa, 1981. – S. 204–214.

[16] *Леонтович Ф.И.* Источники русско-литовского права. – Варшава, 1894. – С. 6–7, 10.

[17] І. Даніловіч нават адзначаў, што ў Статутах шмат «славянскага», але крыніцы паходжання не даследаваў. *Данилович И.* Взгляд на литовское законодательство и литовские Статуты // Юридические записки, издаваемые П. Редкиным. – Т. 1. Москва, 1841. – С. 46.

[18] Спісы Рускай Праўды за XVI–XVII стст. захаваліся ў калекцыях у Кіеве. За інфармацыю дзякую Святлане Блашчук.

[19] *Леонтович Ф.И.* Источники русско-литовского права. – С. 19; *Максимейко Н.* Источники уголовных законов Литовского Статута. – Киев, 1894. – С. 7–9, 33; *Скитский И.И.* Невенованные вдовы по Литовскому Статуту. С. 35–38; *Ehrenkreitz S.* Stan badań nad Statutami litewskimi // Ateneum Wileński. 1924. – № 7–8. – S. 323–338; *Пичета В.И.* Литовский Статут 1529 г. и его источники // Пичета В.И. Белоруссия и Литва XV–XVI вв. Сборник трудов. – Москва, 1961. – С. 503–504; Lithuanian Statute of 1529. Studies in East European history / Ed. and tr. by Karl von Loewe. – Belgium, 1976. – P. 2–7.

Статута[20]. Станіслававас Лазутка вельмі крытычна паставіўся да тэзы, што Руская Праўда – асноўная крыніца Статута[21].

Адносна сямейнага права Мікалай Максімейка адзначыў непасрэдны ўплыў Рускай Праўды на сямейнае права ВКЛ, а ў прыватнасці на такія аспекты, як спадкаемства, статус удавы, незаконнанароджаныя дзеці[22]. Яго думка была падтрымана Карлам ван Лоэвам[23]. Станіслававас Лазутка і Ірэна Валіканітэ лічылі, што на момант прыняцця Статута 1529 г. Руская Праўда была ўжо забыта[24]. Юргіта Кунсманаітэ звярнула ўвагу на падабенства Рускай Праўды з першымі прывілеямі ВКЛ і адзначыла апасрэдаваны ўплыў старажытнага заканадаўчага акта[25].

Вядомы Кароткая і Поўная рэдакцыі Рускай Праўды. Выяўленыя даследчыкамі спісы паходзяць з Маскоўскага княства, але да ВКЛ яны таксама маюць дачыненне. Напрыклад, Таўстоўскую кормчую, у якой утрымлівалася Руская Праўда, звязваюць з кіеўскім мітрапалітам Кіпрыянам[26]. Яго рэлігійная дзейнасць была звязана з двюма дзяржавамі. Але функцыянаванне Рускай Праўды на тэрыторыі ВКЛ патрабуе асобнага даследавання. Поўная рэдакцыя Рускай Праўды змяшчала асобныя артыкулы, якія непасрэдна рэгулявалі шлюбныя стасункі. Артыкулы пра ўдаву (№ 93, 99, 101) рэгламентавалі атрыманне выдзелу з маёмасці мужа пасля яго смерці ў тым памеры, як гэта было ім прызначана, маёмасныя дачыненні з дзецьмі, а таксама другі шлюб удавы. Тэрмін «вена» не выкарыстоўваўся ў Рускай Праўдзе. Яшчэ адзін артыкул адзначаў, што пры наяўнасці ў сям'і братоў дзяўчына не мела права на спадчыну (№ 95). Браты вылучалі ёй пасаг па сваёй заможнасці. Ужо тады быў вядомы гендэрны прынцып падзелу бацькоўскай маёмасці: нерухомая – сынам, рухомая – дочкам. Да незаконных пазашлюбных сексуальных сувязей адносілі стасункі з асобамі неадпаведнага статусу – рабамі. Дзеці, народжаныя ад рабыні, лічыліся незаконнымі і не мелі права на спадчыну (№ 98)[27].

---

[20] *Пичета В.И.* Литовский Статут 1529 г. и его источники. – С. 514–515.

[21] *Лазутка С.* Академическое издание I Литовского Статута // Первый Литовский Статут 1529 г. – Вильнюс, 1982. – С. 150.

[22] *Максимейко Н.* Русская Правда и литовско-русское право. – Киев, 1904. – С. 9–11.

[23] Lithuanian Statute of 1529. – P. 6–8.

[24] Тэндэнцыйнасць літоўскіх даследчыкаў у гэтым пытанні абсалютна зразумела. Яны больш схільны шукаць падабенства звычаёвага права ВКЛ з прускім звычаёвым правам, чым са спадчынай Кіеўскай Русі. *Лазутка С., Валиконите И.* Имущественное положение женщины (матери, жены, дочери, сестры) привилегированного сословия по I Литовскому Статуту // Научные труды высших учебных заведений Литовской ССР. История. XVI. – Вып. 2. – Вильнюс, 1976. – С. 82.

[25] *Kunsmanaitė J.* Provisions for Widowhood in the Legal Sources of Sixteenth-Century Lithuania. Doctoral Thesis for the degree of Doctor of Philosophy. – Budapesht, Hungary, 2009. On the website: http://www.hist-medstud.phd.ceu.hu/download/Defense,%20predefense/Kunsmanaite.pdf. – P. 173–175.

[26] *Тихомиров М.Н.* Исследование о Русской Правде (происхождение текстов). – М.; Л., 1941. – С. 72, 132.

[27] *Владимирский-Буданов М.Ф.* Хрестоматия по истории русского права. Вып. 1. Изд. 2. – Киев, 1876. – С. 81–88; *Его же.* Очерки из истории литовско-русского права. – Киев, 1889. – С. 39; *Его же.* Обзор истории русского права. – Москва, 2005. – С. 120–121; *Калачов Н.В.* Предварительные юридические сведения для полного объяснения Русской Правды. – Вып. 1. Изд. 2-е. – СПб., 1880. – С. 167–168; *Максимейко Н.* Русская Правда и литовско-русское право. – Киев, 1904. – С. 9–10;

Аднак з Рускай Праўды да рэгулявання шлюбных дачыненняў можна аднесці толькі згаданыя артыкулы. Яны заклалі некаторыя маёмасныя прынцыпы адносна шлюбу: пасаг[28], прызначэнне за яго часткі маёмасці, адхіленне ад спадчыны пазашлюбных дзяцей[29]. Падыход да шлюбных дачыненняў быў падобны да артыкулаў Статута 1529 г.[30], але тэкст артыкулаў не ідэнтычны цалкам. Заўважым, што немагчыма патрабаваць ад нормаў Рускай Праўды абсалютнага падабенства з нормамі Статута ВКЛ. Узровень развіцця прававой думкі быў розны, адпаведна быў розны спосаб выкладання прававой нормы. Колькасць артыкулаў пра шлюбныя дачыненні ў Рускай Праўдзе невялікая. Гэта тлумачыцца тым, што гендэрныя адносіны, у асноўным, былі ў кампетэнцыі царквы. Рускую Праўду дапаўняў Статут Яраслава, якім кіраваліся ў духоўных судах[31]. Адзначаныя артыкулы былі складзены пад моцным уплывам візантыйскага права[32]. Праз іх маёмасныя адносіны ў сям'і траплялі ў сферу дзейнасці свецкага права. Руская Праўда акумулявала ў сабе пэўныя падыходы і прынцыпы візантыйскага сямейнага права і спрыяла іх засваенню ў звычаёвым праве ВКЛ.

На нашу думку, асновы звычаёвага права былі закладзены не толькі Рускай Праўдай, але і іншымі зводамі заканадаўства. Толькі ў адной працы была звурнута ўвага, што з прыняццем хрысціянства на нашы землі патрапілі кормчыя, у склад якіх уваходзіла не толькі кананічнае права, але, і цывільнае – у навелах Юстыніяна, Законе градскім, Законе судным людзям[33]. Ігнацій Даніловіч лічыў, што немагчыма прасачыць непасрэдны ўплыў візантыйскага права на права ВКЛ. Але пры гэтым адзначаў, што праваслаўнае духавенства прытрымлівалася намаканона, аб чым сведчылі прывілеі царкве 1503 і 1507 гг. Даследчык адносіў перыяд паміж першым і трэцім Статутамі да перыяду актыўнага пераймання рымскага права[34]. У сучаснай гістарыяграфіі ўздзеянне візантыйскага права на заканатворчыя працэсы ў ВКЛ прадстаўляецца як нявысветленая праблема[35].

---

Российское законодательство X–XX веков. В 9 т.: Т. 1. Законодательство Древней Руси / Отв. ред. В.Л. Янин. – Москва, 1984. – С. 70–72, 116–118 (Тут змяшчаецца асноўная гістарыяграфія па Рускай Праўдзе).

[28] М. Любаўскі лічыў, што артыкул аб пасагу ўвайшоў у звычаёвае права ВКЛ. *Любавский М.* Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского Статута. – Москва, 1892. – С. 575–576.

[29] У Статуце 1529 г. утрымліваўся падобны артыкул пра бенкартаў, але сацыяльнае паходжанне жанчыны не было абмежавана толькі статусам чэляддзю (гл. далей).

[30] *Максимейко Н.* Русская Правда и литовско-русское право. – Киев, 1904. – С. 9–11; Lithuanian Statute of 1529. – P. 6–12.

[31] *Щапов. Я.П.* Княжеские уставы и церковь в Древней Руси XI–XIV вв. – Москва, 1972. – С. 304–305; *Его же.* Государство и церковь Древней Руси X–XIII вв. – Москва, 1989. – С. 108–110, 116–117.

[32] *Владимирский-Буданов М.Ф.* Обзор истории русского права. – С. 122. У працах адзначаецца перайманне некаторых нормаў з Закона суднага людзям у Рускай Праўдзе: *Тихомиров М.Н.* Исследование о Русской Правде. – С. 58–59; *Толочко О.П.* Краткая редакция Правды Русской: происхождение текста. – Киев, 2009. С. 72–76.

[33] *Bossowski F.* Nowela Justynjana 115 – Statut Litewski I R. IV. Art 13 (14), Statut Litewski II i III R. VIII. Art. 7. – T. X. Cz. 1. Art. 167 // Księga pamiątkowa ku uczczeniu czterechsetnej rocznicy wydania pierwszego Statutu Litewskiego. – Wilno, 1935. – S. 110.

[34] *Daniłowicz I.* Rzut oka historyczny na prawodawstwo litewskie // Pamiętnik Naukowy. 1837. – T. 1. – Zesz. 2. – S. 244, 255–260, 266–267.

[35] *Godek S.* Elementy prawa rzymskiego w III Statucie litewskim (1588). – Warszawa, 2004. – S. 14.

Змест кормчых быў вядомы духавенству і князям, якія першымі прынялі праваслаўе. Пра распаўсюджанасць намаканонаў сярод свецкіх людзей сведчыць забарона Віленскага сабора 1509 г. трымаць падобныя кнігі ў сябе пад страхам адлучэння[36]. Праз кормчыя сталі пашырацца ідэі з візантыйскага і рымскага права. Гэта непасрэдна паўплывала на заканадаўства першых стагоддзяў пасля прыняцца хрысціянства, на Статуты Уладзіміра і Яраслава, якія былі створаны на аснове намаканонаў[37]. Да таго ж кормчыя выкарыстоўваліся ў свецкіх судах, што пазней паўплывала на свецкае заканадаўства[38]. Некаторыя палажэнні сямейнага права з заканадаўчых актаў, якія змяшчаліся ў кормчых, былі адаптаваны ў Маскоўскай Русі[39]. Апошнія працы расійскіх даследчыкаў выразна адзначаюць непасрэдны ўплыў візантыйскага права на сямейнае права Старажытнай Русі[40]. На нашай тэрыторыі гэтыя тэндэнцыі таксама мелі месца. Але рэцэпцыя права здзяйснялася ў кожным краі са сваімі асаблівасцямі. Уладзімір Спасовіч асцярожна адзначыў, што ў ВКЛ валоданне мужам і жонкай сваёй маёмасцю паасобку, верагодна, склалася пад уплывам візантыйскага і рымскага права[41]. Аб запазычанні асобных нормаў сямейнага права (аб пакаранні за збіццё бацькі ці маці) у Статут 1529 г., а за ім і ў Статуты 1566, 1588 гг. было адзначана ў працы Францішка Басоўскага. 115 навела была змешчана ў Законе судным людзям (Эклозе)[42] і Законе градскім (Прахіроне 879 г.)[43], якія былі ў складзе кормчых.

---

[36] Русская историческая библиотека. Т. 4. Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 1. – СПб., 1878. Стб. 15; *Дмитриев М.В.* Между Римом и Царьградом: Генезис Брестской церковной унии 1595–1596 гг. – Москва, 2003. – С. 89.

[37] *Павлов А.* Первоначальный славяно-русский номоканон. – Казань, 1869. – С. 13–14, 22, 108; *Розенкампф Г.А.* Обозрение Кормчей книги в ее историческом виде. – СПб., 1839. – С. 39; *Щапов Я.Н.* Византийское и южнославянское правовое наследие на Руси в XI–XIII вв. – Москва, 1978; *Владимирский-Буданов М.Ф.* Обзор истории русского права. – Москва, 2005. – С. 117–118; *Пазнякоў В.* Кормчыя кнігі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 4. – Мінск, 1997. – С. 238.

[38] *Калачов Н.* О значении Кормчей в системе древнего русского права // Чтения в Императорском обществе истории и древностей Российских при Московском университете. – 1847. – № 3. – С. 16.

[39] *Ланге О.* О правах собственности супругов по древнерусскому праву. – СПб., 1886. – С. 53–57; *Неволин К.А.* Полное собрание сочинений. – Т. 3. История Российских гражданских законов. – СПб., 1857.

[40] *Дементьева Т.Ю.* Семейное и наследственное право в Киевской Руси: IX–XII вв. / Автореф. дис. ... канд. юрид. наук. – Казань, 2006; *Оспенников Ю.В.* Право государств Северо-Западной Руси в XII–XV вв. / Автореф. дис. … доктора юрид. наук. – Казань, 2010.

[41] *Спасович В.Д.* Об отношениях супругов. – С. 148.

[42] Закон судны людзям (Эклога) прыйшоў на славянскія землі з Балгарыі, быў пераробкай тэстаў Льва Ісаўра і Канстанціна Капроніма 740 г. *Суворов Н.С.* Следы западно-каталического церковного права в памятниках древнего русского права. – Ярославль, 1888. – С. 4.

[43] Закон градскі, г.зн. Прахірон візантыйскага імператара Васілія Македаняніна, які быў выдадзены ў VIII ст. Пераклад яго вядомы з XIII ст., а ў перыяд XV – першай палове XVII стст. сустракаецца ў складзе кормчых, напісаных і выдадзеных на беларускіх і ўкраінскіх землях. Былі вядомы поўная і скарочаная версіі Прахірона: *Павлов А.* Первоначальный славяно-русский номоканон. – С. 13–14; *Бенеманский М.* Закон градский. – С. 7, 10, 15, 21, 108; *Тихомиров М.Н.* Исследование о Русской Правде. – С. 58; Восточная Европа в древности и в средневековье / Под ред. Л. Черепнина. – Москва, 1978. – С. 258; *Янин В.* Законодательство Древней Руси. Т. 1. – Москва, 1984. – С. 24; *Щапов Я.* Прохирон в восточнославянской письменности // Византийский временник. 1977. – Т. 38. – С 49–52.

Адтуль яна патрапіла ў Статут 1529 г. Але калі грэчаскае права давала толькі бацьку магчымасць у выпадку фізічнага гвалту адмовіцца ад дзіцяці, то права ВКЛ пакідала гэта права і за маці[44]. Адзначым, што гэтая норма была ўключана ў Статут Яраслава[45], значыць, яна выкарыстоўвалася ў духоўным судзе, што спрыяла распаўсюджванню ведаў пра яе ў грамадстве.

Звернемся да нормаў сямейна-шлюбным дачыненнях, якія ўтрымліваліся Законе судным людзям і Законе градскім. Напрыклад, Эклога ўстанаўлівала шлюбны ўзрост для юнакоў 15 год, а для дзяўчат – 13, іншыя заканадаўчыя акты – з 12[46], але заручыць маглі з 7 год. Рэгламентавалася складанне перадшлюбнай дамовы ў пісьмовай форме. Акрамя таго прадугледжваліся падарункі ці зарука, якія станавіліся кампенсацыяй пры зрыве заручынаў. Непаўналетнія мелі права скасаваць заручыны[47]. Шлюб суправаджаўся дамовай у пісьмовай ці вуснай форме. Апошняя не змяншала правоў жанчыны. Пры няслушным выдаленні з дому мужа яна атрымлівала назад пасаг і ¼ яго маёмасці. Вена запісвалася на маёмасці мужа і складала роўны пасагу кошт. Пасаг складаўся з рухомых рэчаў (вопраткі, грошай, каштоўнасцяй), рабоў, жывёлы і інш. У выпадку смерці жонкі, з якой не было дзяцей, пасаг вяртаўся сям'і, а ¼ пакідалася мужу. Калі муж паміраў першы, то пасаг і ¼ маёмасці мужа атрымлівала жонка. Другі раз жанчыне дазвалялася выйсці замуж праз год пасля смерці мужа[48].

Эклога даволі падрабязна распісвала шлюбныя дачыненні[49]. З пералічаных нормаў у практыку ВКЛ увайшлі перадшлюбная дамова, выдзяленне пасагу і запіс вена, вяртанне пасагу бяздзетнай жонцы, шлюбны ўзрост. Спачатку яны рэгламентаваліся звычаёвым правам, а пазней аформіліся ў артыкулы Статутаў. Толькі перадшлюбная дамова засталася ў сферы дзейнасці звычаёвага права, хоць афармлялася як дакумент і мела юрыдычную моц.

Шлюбныя дачыненні рэгламентаваліся ў Законе градскім: 1–10 грані[50] прысвячаліся шлюбу[51], а 11 – разводу. Заканадаўства дазваляла заручыць дзяцей з 7 год. Заручыны нельга было скасаваць без слушнай прычыны. Дзяўчыну павінен быў выдаваць замуж бацька, але яна павінна была выказаць згоду на шлюб. У абавязак бацькоў уваходзіла даць дачцэ вена і перадшлюбныя падарункі ў залежнасці ад сваёй заможнасці. Падчас заручынаў з жаніха браўся грашовы заклад. Асобы жаночага полу не мелі права самастойна сябе заручыць.

---

[44] *Bossowski F.* Nowela Justynjana 115 – Statut. – S. 107–111; *Bardach J.* Statuty litewskie jako wyraz kultury prawnej epoki i ich oddziaływanie na kraje sąsiednie. – S. 315.

[45] Древнерусские княжеские уставы XI–XV вв. – Москва, 1976. – С. 106.

[46] *Костогрызова Л.Ю.* Правовое положение женщины в Византии // Российский юридический журнал. – 2001. – № 3. – С. 94.

[47] Эклога. Византийский законодательный свод VIII века / Вступ. ст., пер., коммент. Е.Э. Липшиц. – Москва, 1965. – С. 44; *Неволин К.А.* Полное собрание сочинений. – Т. 3. – С. 204–206.

[48] Эклога. – С. 45–47; *Костогрызова Л.Ю.* Правовое положение женщины в Византии. – С. 94, 95.

[49] *Щапов Я.* Эклога законов в русской письменной традиции // Византийский временник. 1993. – Т. 54. – С. 93–94; *Медведев И.П.* Правовая культура Византии. – СПб., 2001. – С. 140–141.

[50] У Законе градскім выкарыстоўваецца тэрмін «грань», а не артыкул. У працы ўжываецца тэрміналогія паводле крыніцы.

[51] *Бенеманский М.* Закон градский. Значение его в русском праве. – Москва, 1917. – С. 113.

Заручыны маглі скасаваць з-за непрыстойнага ладу жыцця мужчыны, розніцы ў веравызнанні, намеру прыняць пострыг. Тады заклад вяртаўся і абое лічыліся свабоднымі. Акрамя бацькоў, заручыць маглі браты, іншыя сваякі, дзяды, а таксама ўлады. Муж прызначаў вена жонцы на сваёй маёмасці за прынесены пасаг. Маёнтак, на якім было запісана вена, нельга было закладаць ці прадаваць. Жанчынам і мужчынам дазвалялі толькі тры шлюбы. Забараняўся таемны шлюб і шлюб з блізкімі сваякамі. Сістэма сваяцтва была распісана ў 7 грані[52].

У Законе градскім вызначаліся парадак заручынаў, перашкоды для шлюбу, маёмасныя правы сужэнцаў і інш. Ён стаў важнай крыніцай для царкоўных юрыстаў, якія звярталіся да зводу законаў пры вырашэнні спраў па сямейна-шлюбных дачыненнях[53]. У перакладах ужываецца тэрмін «вена» як адносна пасагу, так і запісу мужчыны за пасаг, таксама было ў судовай практыцы ВКЛ[54]. Гэтае слова выкарыстоўваецца ў спісах за XIV, XVI, XVII стст. На нашу думку, менавіта з гэтага зводу закону тэрмін трапляе ў звычаёвае права, а пасля ў сямейнае заканадаўства ВКЛ. Найбольш верагодна, што Закон градскі і Эклога паўплывалі на распаўсюджванне звычаю заручынаў непаўналетніх асобаў, які праіснаваў да пачатку XVI ст.

Візантыйскае і рымскае сямейнае права разглядала мужа і жонку як асобных уласнікаў, якія не мелі агульнай уласнасці. Бацькі абавязаны былі выдаць пасаг, але пасля шлюбу. Пра пасаг дамаўляліся ў вуснай ці пісьмовай формах. Муж мог карыстацца прыбыткам ад пасагу, але канчаткова ён яму не належаў. Заканадаўства прадугледжвала вяртанне пасагу сваякам жанчыны пасля яе смерці, калі шлюб быў бяздзетным. Пры страце пасагу муж абавязаны быў выплаціць кампенсацыю. Шлюб павінен быў здзяйсняцца без прымусу, але з волі бацькоў, сваякоў, апекуноў ці ўладаў. Адно з цяжкіх злачынстваў лічылася выкраданне жанчыны, каб узяць з ёй шлюб. Былі вызначаны перашкоды для шлюбу: сваяцтва, знаходжанне ў шлюбе з іншай асобай, розніца ў сацыяльным статусе[55].

У звычаёвае права ВКЛ з рымскага і візантыйскага права трапляюць асобныя палажэнні, якія пазней сталі нормамі права: шлюбны ўзрост, выдача пасагу ў рухомых рэчах, вяртанне пасагу ў бацькоўскі дом бяздзетнай жанчыны, запіс

---

[52] Мерило праведное, XIV в. Рэжым доступу: http://www.stsl.ru/manuscripts/book.php?col=1&manuscript=015; Nomokanon, XVI w. // Biblioteka Narodowa. Akc. 2731. K. 355-370; Nomokanon recensionis serbicae sive collectio canonum ss. Apostolorum et conciliorum. 1599 // Biblioteka Narodowa. Rps. Akc. 10782. K. 319–321v., 337–360; Правила святых (номоканон), XVII // Biblioteka Narodowa. Rps. Akc. 2737. K. 360–367; Кормчая, XVII ст. // Аддзел рукапісаў БЛАН. – Ф. 19. Спр. 242. Арк. 584–610; *Ланге О.* О правах собственности супругов по древнерусскому праву. – СПб., 1886. – С. 53–57; *Неволин К.А.* Полное собрание сочинений. Т. 3. – С. 163, 138–141, 175–179, 206–207.

[53] *Щапов Я.* Прохирон в восточнославянской письменности. – С. 53.

[54] *Лазутка С., Валиконите И., Киркене Г., Карпавичене И.* Введение // Lietuvos Metrika. – Kn. 224 (1522–1530): 4-oji Teismų knyga. – P. CXX; Lietuvos Metrika. – Kn. 224 (1522–1530): 4-oji Teismų knyga. – P. 384.

[55] Памятники римского права: Законы 12 таблиц. Институции Гая. Дигесты Юстиниана. – Москва, 1997. – С. 529–557; *Hanter W.A.* Roman Law in the Order of a Code. Forth edition. – London, 1803. – P. 677–683; *Lind G.* Common law marriage: a legal institution for cohabitation. – Oxford University Press, 2008. – P. 37–62; *Неволин К.А.* Полное собрание сочинений. – Т. 3. – С. 87–92, 138–141, 143–144, 148–149, 167, 201.

вена на нерухомай маёмасці, перыяд жалобы для ўдавы[56]. Перайманне адбывалася не толькі на ўзроўні асобных артыкулаў, але і ідэй, якія інтэрпрэтаваліся і апрацоўваліся мясцовымі традыцыямі.

У звычаёвае права ВКЛ тэрмін «трацiна» прыходзіць з візантыйскага права, у якім было вядомы інстытут *trimorii*[57]. Таксама 1/3 фігуруе ў артыкулах пра развод у навелах Юстыніяна. Жанчына атрымлівала 1/3 шлюбных падарункаў, калі ў разводзе быў вінаваты мужчына[58]. Юліуш Бардах выказаў гіпотэзу, што рэцэпцыя трацiны трапіла з заходне-еўрапейскага права праз Польшчу. Такое меркаванне даследчыку дазволіла зрабіць вядомасць трацiны ў Еўропе з Сярэднявечча і адсутнасць доказнай базы па карысць візантыйскага паходжання. Але пры гэтым засталося незразумелым, чаму ў Польшчы не была распаўсюджана такая з'ява, калі гэтая краіна стала транзітнай[59]. Адносна Еўропы вядома, што ў франкаў шлюбны дар для жанчыны прызначаўся на 1/3 частцы маёмасці мужа. Больш падрабязна гэта прадстаўлена ў Бургундскіх законах (501, 517 гг.)[60].

Аднак такое шырокае распаўсюджанне трацiны на нашых землях у XV ст. магло быць толькі ў тым выпадку, калі яна да гэтага была неад'емнай часткай звычаёвага права. Зыходзячы з таго, што кормчыя набылі сваё распаўсюджанне ў перыяд XI–XIII стст.[61], можна казаць, што на XIV ст. інфармацыя з візантыйскага права была вядома ў грамадстве. У ВКЛ «трацiна» фігуравала ў вяноўных запісах, функцыянавала ў маёмасных дачыненнях у перыяд кіравання Казіміра Ягелончыка (спадкаемства, вена, усынаўленне)[62]. Каб абараніць інтарэсы сваякоў, асобе дазвалялася распараджацца толькі 1/3 маёмасці[63].

Больш складана прасачыць увядзенне ў Статуты нормы па выдзяленню пасагу з ¼ бацькоўскай маёмасці. Але ў рэгуляванні маёмасных дачыненняў паміж мужам і жонкай у Эклозе фігуруе ¼ частка. Вылучэнне на карысць дачок большай часткі маёмасці пагражала эканамічнай небяспекай для сям'і і роду. Таму чвэрць была найбольш прымальнай доляй на пасаг, чым трацiна.

Руская Праўда і заканадаўчыя акты візантыйскага права былі пісанымі нормамі права. Аднак яны не з'яўліся нормамі афіцыйна прынятымі ў ВКЛ. На іх не спасылаліся пры вырашэнні судовых спраў у свецкіх судах. Аднак веданне гэтых зводаў права спрыяла развіццю звычаёвага права. Блізкія для грамадства

---

[56] У Статутах ён быў скарочаны, гл. аб гэтым далей.

[57] *Bossowski F.* Nowela Justynjana 115 – Statut Litewski. – S. 113–114.

[58] Кормчая, XVII ст. // Аддзел рукапісаў БЛАН. – Ф. 19. – Спр. 242. – Арк. 547–548; *Неволин К.А.* Полное собрание сочинений. – Т. 3. – С. 167–168, 243–245; *Загоровский А.* О разводе по русскому праву. – Харьков, 1884. – С. 113–114.

[59] *Bardach J.* Trzecizna. – S. 123, 124, 138.

[60] *Ланге О.* О правах собственности супругов по древнерусскому праву. – СПб., 1886. – С. 31–32.

[61] *Загоровский А.* О разводе по русскому праву. – Харьков, 1884. – С. 69–76; *Громогласов И.М.* Канонические определения брака и значение их при исследовании вопроса о форме христианского бракозаключения // Богословский вестник. – Сергиев Посад, 1907. – № 11. – С. 442–445; *Bardach J.* Świecki charakter zwyczajowego prawa małżeńskiego ludności ruskiej Wielkiego Księstwa Litewskiego (XV–XVII wieku) // Czasopismo Prawno-Historyczne. 1963. – T. XV. – Z. I. – S. 107–109; *Щапов Я.Н.* Византийское и южнославянское правовое наследие. – С. 139, 153.

[62] *Bardach J.* Trzecizna. – S. 125–135.

[63] *Любавский М.* Областное деление и местное управление. – С. 568.

нормы былі не проста запазычаны, а дапасаваны да традыцый і ўяўленняў пра сямейна-шлюбныя дачыненні. Звычаёвае права стала асновай для судовай практыкі і заканадаўства, але не страціла сваю актуальнасць пасля прыняцця Статутаў.

Заканадаўчую моц мелі *агульназемскія і земскія прывілеі*. Яны адыгралі важную ролю ў станаўленні права[64], далі пачатак прававому афармленню шляхецкага саслоўя. Па сямейным праве ў іх утрымліваліся артыкулы пра шлюб, спадкаемства, статус удавы[65].

Прывілей Уладзіслава (Ягайлы) 1387 г. дазваляў прадстаўнікам вышэйшага саслоўя ВКЛ каталіцкага веравызнання свабодна выдаваць замуж дачок, унучак, сваячак і ўдоў. Вянчанне павінна было здзяйсняцца па каталіцкім абрадзе. Удава магла заставацца на маёнтках мужа, пакуль не выходзіла замуж. А маёмасць памерлага мужа пакідалася спадчыннікам. У наступным шлюбе жанчына ўжо не надзялялася пасагам[66].

Амаль адначасова Уладзіславам быў выдадзены яшчэ адзін прывілей, у якім было забаронена браць шлюб каталікам з праваслаўнымі. А калі такі шлюб ужо меў месца, то муж ці жонка павінны былі перайсці ў каталіцкае веравызнанне. У выпадку парушэння пастаноў прывілея праваслаўнаму сужэнцу пагражала фізічнае пакаранне, пасля якога шлюб прызнаваўся сапраўдным[67]. У літоўскай гістарыяграфіі гэты дакумент разглядаецца як абарона ліцвінаў-каталікоў ад уздзеяння культуры беларускага («русінскага») насельніцтва, якое перавышала па колькасці і прытрымлівалася праваслаўнай рэлігіі[68]. Шлюб быў адным са

---

[64] Характарыстыку прывілеяў як дакументаў і крыніц права гл.: *Ясинский М.Н.* Уставные земские грамоты литовско-русского государства. – Киев, 1889; *Леонтович Ф.И.* Источники русско-литовского права; *Якубовский И.Б.* Земские привилеи Великого княжества Литовского // Журнал Министерства народного просвещения (далей — ЖМНП). 1903, апрель. – С. 239–278.

[65] *Лазутка С., Валиконите И.* Имущественное положение. – С. 81.

[66] Zbiór praw litewskich od roku 1389 do roku 1529 tudzież rozprawy sejmowe o tychże prawach od roku 1544 do roku 1563. – Poznań, 1841. – S. 1–2; *Daniłowicz I.* Skarbiec dyplomatów papieskich, cesarskich, królewskich, książęcych. – T. 1. – Wilno, 1860. – S. 265–266; *Вішнеўскі А.Ф., Юхо Я.А.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Вучэбны дапаможнік. – Мінск, 1998. – С. 40–42; Lietuvos Metrika. Kn. 25 (1387–1546): Užrašymų knyga 25 / Parengė D. Antanavičius, A. Baliulis. – Vilnius, 1998. – P. 35–37; *Спасович В.Д.* Об отношениях супругов. – С. 149; *Любавский М.К.* Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно. 3-е изд. – СПб., 2004. – С. 87, 463; *Ясинский М.Н.* Уставные земские грамоты литовско-русского государства. – С. 17; *Леонтович Ф.И.* Источники русско-литовского права. – С. 26; *Чарнецкий*. История Литовского Статута с объяснением особенностей трех его редакций // Университетские известия. – Киев, 1867. – № 1. – С. 3.

[67] *Daniłowicz I.* Skarbiec dyplomatów. – T. 1. – Wilno, 1860. – S. 266; *Леонтович Ф.* Правоспособность литовско-русской шляхты // ЖМНП. – Ч. 14. Март. – СПб., 1908. – С. 60–61; *Чарнецкий*. История Литовского Статута. № 1. – С. 4; *Любавский М.К.* Очерк истории Литовско-Русского государства. – С. 91; *Дзербіна Г.* Права і сям'я эпохі Рэнесансу. – С. 109–110; *Liedke M.* Mieszane związki małżeńskie a polonizacja możnych Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVI wieku // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – Białystok, 1997. – S. 128; *Mironowicz A.* Prawosławne żony i matki królów książąt polskich // Latopisy Akademii Supraślskiej. Vol. 1. Prawosławny w dziejach Rzeczypospolitej. – Białystok, 2010. – S. 20.

[68] Падрабязней аб гэтым гл.: *Błaszczyk G.* Dzieje stosunków polsko-litewskich. T. II. Od Krewa do Lublina. – Cz. 1. – Poznań, 2007. – S. 212; *Andriulis V.* Lietuvos Statutų (1529, 1566, 1588 m.) šeimos teisė. – Vilnius, 2003. – P. 56.

шляхоў пераходу ў іншую рэлігію. Таму забарона міжканфесійных шлюбаў была слушнай і адпавядала канцэпцыі каталіцкай царквы.

Гарадзельскі прывілей 1413 г. таксама ўключаў пункты аб шлюбе. Мужчынам дазвалялася запісваць вена жонкам на сваіх уладаннях. Дачок і сваячак мелі права выдаваць замуж па сваім меркаванні за каталікоў. У абодвух выпадках ішла спасылка на звычаі, прынятыя ў Польшчы. У гэтым прывілеі ўпершыню адзначана пра запіс вена на нерухомасці[69].

Па Прывілеі 1447 г.[70] удава мела права заставацца на маёмасці мужа, пакуль не пойдзе замуж па сваім жаданні. Маёмасць пакідалася дзецям, а калі іх не было – самым блізкім сваякам мужа. Жанчына мела права распараджацца венам, калі яно ёй было запісана. Было дазволена выдаваць замуж дзяўчат, пляменніц і ўдоў, не дакладваючы аб гэтым намеснікам, але абавязкова па хрысціянскім звычаі. Адносна ўдоў адзначалася, што трэба кіравацца нормамі, якія дзейнічаюць у Польшчы[71].

Прывілей Аляксандра Ягелончыка 1492 г. не толькі пацвердзіў за ўдавой права трымаць маёмасць да наступнага шлюбу, але і права распараджацца венам, калі быў адпаведны запіс мужа. Асобаў жаночага полу дазвалялася выдаваць замуж без інфармавання гаспадара[72] ці намеснікаў, але па каталіцкім абрадзе. Упершыню ўводзілася пастанова выдаваць замуж за мяжу з рухомымі рэчамі, а нерухомасць заставалася сваякам. Прывілей 1506 г. пацвердзіў пастановы папярэдніх прывілееў[73].

---

[69] Zbiór praw litewskich. – S. 7–20; *Daniłowicz I.* Skarbiec dyplomatów. T. 2. – Wilno, 1862. – S. 17–19; Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 1. – Минск, 1959. – С. 116; Lietuvos Metrika. Kn. 25 (1387–1546): Užrašymų knyga 25. – P. 44–47; *Ясинский М.Н.* Уставные земские грамоты. – С. 18; *Леонтович Ф.И.* Источники русско-литовского права. – С. 28; *Барбашев А.* Витовт последние двадцать лет княжения. 1410–1430. – СПб., 1891. – С. 120–123; *Любавский М.К.* Литовско-Русский сейм. Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешней жизнью государства. – Москва, 1900. – С. 464; *Любавский М.* Областное деление. – С. 569; *Bardach J.* Trzecizna. – S. 132; *Kunsmanaitė J.* Provisions for Widowhood. – P. 58–59.

[70] *Любавский М.К.* Литовско-Русский сейм. – С. 47–49, 465; *Его же.* Очерк истории Литовско-Русского государства. – С. 99–104; *Пичета В.И.* Литовский Статут 1529 г. и его источники // Пичета В.И. Белоруссия и Литва XV–XVI вв. Сборник трудов. – Москва, 1961. – С. 517–521; *Яковенко Н.М.* Українська шляхта з кінця XIV до середини XVII ст.: (Волинь і Центральна Україна). – Київ, 1993. – С. 42–43.

[71] Zbiór praw litewskich. – S. 32–33; АЗР. – Т. 1. 1340–1506. – СПб., 1846. – С. 75; *Daniłowicz I.* Skarbiec dyplomatów. T. 2. – Wilno, 1862. – S. 205–206 (памылковая дата 1457 г.); Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 1. – Мн., 1959. – С. 124–126; *Вішнеўскі А.Ф., Юхо Я.А.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. – С. 43–46; Lietuvos Metrika. Kn. 25 (1387–1546): Užrašymų knyga 25. – P. 47–49; *Максимейко Н.* Источники уголовных законов Литовского Статута. – Киев, 1894. – С. 13–14; *Любавский М.* Областное деление. – С. 569; *Леонтович Ф.И.* Источники русско-литовского права. – С. 30.

[72] У тагачасных крыніцах вялікі князь літоўскі называўся гаспадаром. Гэты тэрмін ужываецца ў працы. Да таго ж вялікі князь літоўскі адначасова быў і польскім каралём. Для скарачэння выкарыстоўваецца пасада, якая мела дачыненне да ВКЛ.

[73] Zbiór praw litewskich. – S. 60, 95–99; Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. – Т. 1: IX–XVIII ст. / Склад. В.К. Шчарбакоў, К.І. Кернажыцкі, Д.І. Даўгаяла. – Мінск, 1936. – С. 328–334; *Вішнеўскі А.Ф., Юхо Я.А.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. – С. 48; Lietuvos Metrika. Kn. 25 (1387–1546): Užrašymų knyga 25. – P. 37–43; *Любавский М.* Областное деление. – С. 569; *Леонтович Ф.И.* Источники русско-литовского права. – С. 31–33; *Лазутка С., Валиконите И.*

К. Няволін і І. Лапо выказалі меркаванне, што гаспадар самавольна распараджаўся лёсам жанчын[74]. Аднак дакументы прадстаўляюць іншую сітуацыю. У XV ст. мелі месца дазволы на шлюб. Іх выдавалі вялікія князі і старосты[75] на падставе звароту мужчыны з просьбай аб шлюбе і праве трымаць маёмасць будучай жонкі. Патрабаваўся дазвол на шлюб з удавою, якая па смерці мужа трымала маёнткі, бо не было сваякоў у мужа, якія б маглі прэтэндаваць на спадчыну, а таксама на шлюб з дзяўчынай, якая была адна ў сям'і і з'яўлялася спадчынніцай нерухомай маёмасці[76]. Неабходнасць атрымаць дазвол была звязана з нясеннем вайсковай службы з уладанняў[77]. Пасля шлюбу такая маёмасць набывала статус айчызны і пераходзіла па мужчынскай лініі[78]. Пасля Статута 1529 г. у такіх просьбах ужо не было неабходнасці, бо статус удавы там рэгламентаваўся, як і яе маёмасны стан.

Прывілеі згадваюць пра дазвол кіравацца польскім заканадаўствам адносна ўдоў, але не называюць дакладна зводы. На той час у Польшчы былі прыняты Вісліцкі Статут 1347 г., Петркаўскі[79] Статут, якія былі аб'яднаны ў Статуты Казіміра III, Статут Ягайлы 1420–1423 гг.[80], у іх шлюбныя дачыненні былі больш падрабязна прадстаўлены, чым у прывілеях ВКЛ.

---

Имущественное положение женщины. – С. 81; Первый Литовский Статут (1529 г.) / С. Лазутка, И. Валиконите, Э. Гудавичус. – Вильнюс, 2004. – С. 357; *Kunsmanaitė J.* Provisions for Widowhood. – P. 63–64.

[74] ИЮМ. Вып. 21. – Витебск, 1900. – С. 415; *Неволин К.А.* Полное собрание сочинений. Т. 3. – С. 147; *Лаппо И.И.* Великое княжество Литовское за время от заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория (1569–1586). Т. 1. – Юрьев, 1911. – С. 519.

[75] Станіслаў Янавіч Кежгайла даў дазвол на шлюб Юрыю Якубовічу з дачкой Юрыя Даўгяловіча – Даротай – і права валодаць 1/3 часткай яе маёмасці, якую яна атрымала пры падзеле з сёстрамі (1492). Lietuvos Metrika. Kn. 225 (1528–1547): 6-oji Teismų knyga. – P. 275.

[76] Гаспадарскі дваранін Іван Уколаў атрымаў дазвол у вялікага князя Жыгімонта Старога на шлюб з дачкой навагарадскай баярыні Феціны Барысавай і адпаведна на трыманне маётнтка Басіна. Аднак маці паведаміла, што мае яшчэ сына Нікона, аб чым змаўчаў І. Уколаў. У сувязі з новымі фактамі ўдаву пакінулі з сынам на маёмасці, яна была абавязана выконваць службу, а дачку мела права выдаць замуж па сваім меркаванні (1513). Такім чынам, Феціна вызвалялася ад абавязку выдаць замуж дачку за І. Уколава. Lietuvos Metrika. Kn. 9 (1511–1518): Užrašymų knyga 9 / Parengė K. Pietkiewicz. – Vilnius, 2003. – P. 100.

[77] Lietuvos Metrika. Kn. 3 (1440–1498): Užrašymų knyga 3 / Parengė L. Anužytė, A. Baliulis. – Vilnius, 1998. – P. 24, 26; *Любавский М.* Областное деление и местное управление. – С. 576–579, 582–583.

[78] Карніла і Івашка Андрэевічы атрымалі пацверджанне на права валодання маёмасцю, што перайшла на іх ад бацькі Андрэя (1499). Апошняму быў дазволены шлюб з дачкой Багдана Тура Свірскага і права трымаць яе маёнткі. Іх сястра дадаткова да пасагу патрабавала яшчэ нерухомую маёмасць. Паны Рады адхілілі яе патрабаванні. Lietuvos Metrika. Kn. 6 (1494–1506): Užrašymų knyga 6 / Parengė A. Baliulis. – Vilnius, 2007. – P. 204–205.

[79] Назва паходзіць ад польскага горада Piotrków. У старабеларускіх тэкстах ужывалася назва Петркаў. У дадзенай працы яе і выкарыстоўваем.

[80] *Hube R.* Prawo polskie w 14-tym wieku: ustawodawstwo Kazimierza Wielkiego. – Warszawa, 1881. – S. 41–98; *Kutrzeba S.* Historia źródeł dawnego prawa polskiego. T. 1. – Lwów; Warszawa; Kraków, 1926. – S. 159–178; *Ливанцев К.Е.* История государства и права феодальной Польши XIII–XIV вв. / Ленинградский государственный университет им. А.А. Жданова / Отв. ред. В.В. Мавродин. – Ленинград, 1958. – С. 101–117; *Лазутка С., Валиконите И.* Имущественное положение женщины. – С. 83.

Вісліцкі Статут быў вядомы ў ВКЛ. Ён быў змешчаны на старонках Супрасльскага летапісу[81], пераклад датуецца XV ст.[82] Аднак перакладзены ён быў з улікам мясцовых асаблівасцей[83]. На падставе гэтага можна выказаць меркаванне, што да яго артыкулаў маглі звяртацца. Паводле Вісліцкага статута дзяўчат выдавалі з пасагам у грошах і рэчах. Пасаг у нерухомай маёмасці вызначаўся каралём. Усталяваны быў парадак выпасажэння пасля смерці бацькі. Калі дзяўчыны атрымалі пасаг, то не мелі права прэтэндаваць на іншую маёмасць. А ў выпадку неатрымання пасагу, сваякі абавязаны былі яго выдаць. Жанчына пасля смерці мужа заставалася на ўдовіным стольцы. Пасля яе смерці маёмасць цалкам пераходзіла дзецям. Замуж яна магла ісці па свайму жаданню, без прымусу. Пасля смерці бяздзетнай жанчыны пасаг вяртаўся да яе сваякоў, а калі былі дзеці – то размяркоўваўся паміж імі[84].

На старабеларускую мову быў зроблены пераклад Статута Ягайлы. У ім адзначалася, што ўдаве прызначаецца толькі вена, а не ўся маёмасць па мужу. Паўналецце для мужчын наступала з 15 год, для жанчын – з 12. Пасаг выдаваўся ў рухомых рэчах[85]. Паводле Петркаўскага Статута, дзяўчыне прызначаўся пасаг, за які яна павінна атрымаць вена. Дзяўчына, якая пагадзілася на выкраданне, пазбаўлялася пасагу. Мужчына мог ажаніцца пасля смерці жонкі, нават калі меў дзяцей у папярэднім шлюбе[86]. У Статуце Ласкага 1506 г. быў толькі адзін пункт, які тычыўся пасагу памерлай жанчыны. У звычаях Кракаўскай зямлі адзначалася, што жонка не мае права запісаць мужу нічога без згоды сяброў, г.зн. свайго асяроддзя. А ў выпадку смерці мужа без запісу вена жанчыне прызначалася 30 марак ці маёмасць з даходам у 3 маркі[87].

---

[81] Упершыню летапіс быў знойдзены і надрукаваны І. Даніловічам: *Daniłowicz I.* Latopisiec Litwy i kronika ruska. – Wilno, 1827.

[82] Гэты тэкст Вісліцкага статута выклікаў вялікаю цікавасць у даследчыкаў. Яму прысвечана шэраг даследаванняў. У гістарыяграфіі дыскутаваліся мова перакладу, датаванне і іншыя аспекты: *Первольф И.И.* Червонорусский перевод Вислицкаго Статута // Труды VI Археологического съезда в Одессе (1884). Т. 1. – Одесса, 1886. – С. 307–309; *Roman S.* Przepisy prawa polskiego w rękopisie supraślskim z początku XVI wieku // Czasopismo Prawno-Historyczne. 1965. – T. XVII. – Zesz. 1. – S. 75–101; *Wandas A.* Uwagi o języku tekstów prawnych z rękopisu supraślskiego // Czasopismo Prawno-Historyczne. 1965. – T. XVII. – Zesz. 1. – S. 103–105; *Улащик Н.Н.* Предисловие // ПСРЛ. – Т. 35. Белорусско-литовские летописи / Подг. Н.Н. Улащик. – Москва, 1980. – С. 5–7.

[83] *Максимейко Н.* Источники уголовных законов. – С. 17–24.

[84] У перакладзе на старабеларускую мову выкарыстана слова «вена», а не «пасаг». АЗР. – Т. 1. 1340–1506. – СПб., 1846. – С. 15, 17–18; *Maciejowski W.A.* Polska aż do pierwszej połowy XVII wieku pod względem obyczajów i zwyczajów w czterech częściach opisana. T. 3. – Petersburg; Warszawa, 1859. – S. 31–34; *Hube R.* Prawo polskie w 14-tym wieku. – S. 114–116, 118–121; *Спасович В.Д.* Об отношениях супругов по имуществу по древнему польскому праву // Сочинения Спасовича В.Д. – Т. 3. – СПб., 1890. – С. 117–126; *Ливанцев К.Е.* История государства и права феодальной Польши. – С. 118–119.

[85] У перакладзе на старабеларускую мову выкарыстана слова «вена», а не «пасаг». АЗР. – Т. 1. 1340–1506. – СПб., 1846. – С. 39.

[86] *Maciejowski W.A.* Historya prawodawstw słowiańskich. T. V. Obejmuje prawo cywilnie karne, tudzież obu postępowanie organizacyą sądową w przestworze XIV–XVIII wieku. – Warszawa, 1865. – S. 53–79; *Hube R.* Prawo polskie w 14-tym wieku. – S. 188–189.

[87] Nihil novi. Z dorobku sejmu radomskiego 1505 roku. – Radom, 2005. – S. 72, 117–118.

Практыка XIV–XV стст. сведчыць пра рэалізацыю нормаў права ў Польшчы. Памер пасагу залежаў ад заможнасці сям'і, складаўся з грошай і рухомых рэчах (вопраткі, каштоўнасцей і інш.). Пасаг перадаваўся ў дзень вяселля ці пазней. Выдаваў яго бацька, а калі ён памёр на той час, то – маці, браты ці іншыя сваякі. Калі не было магчымасці выдзяліць пасаг у рухомых рэчах, то застаўлялі маёмасць. Вена запісвалася прыкладна такіх жа памераў, як унясенне. Маёмасцю, на якой было прызначана вена, муж мог распараджацца са згоды жонкі. Пасля смерці мужа жанчына мела права валодаць маёнткам да сваёй смерці ці да наступнага шлюбу. Сваякі былі зацікаўлены атрымаць уладанні, таму выплачвалі вена. Удава, якая зноў выходзіла замуж, звычайна давала мужу пасаг і вена ад першага шлюбу цалкам ці часткова. Пасля смерці жанчыны пасаг пераходзіў яе чамы блізкім сваякам, а вена – сваякам мужа[88].

У артыкулах і судовай практыцы па сямейным праве Польшчы прасочваецца падабенства з нормамі права ВКЛ. У польскай гістарыяграфіі XIX ст. лічылася, што крыніцай права для ВКЛ стала Польшча. С. Лазутка лічыў беспадстаўнай гэту тэзу[89]. Мікалай Максімейка адзначыў, што пераймание магло ісці ў сферы дзяржаўнага кіравання, але не ў сферы крымінальнага права, дзе большае значэнне мела мясцовае звычаёвае права[90]. У галіне сямейнага права і шлюбных дачыненняў нельга казаць пра абсалютнае пераймание з Польшчы, можна адначыць толькі пра ўплыў. Выдзяленне пасагу ў грошах і рухомых рэчах, як і прызначэнне вена вядома не толькі ў польскім праве. Пэўнае падабенства са звычаёвым правам і заканадаўствам ВКЛ адносна пасагу ўтрымліваецца ў нормах Вісліцкага статута і Статута Ягайлы. Аднак заканадаўчыя акты Польшчы былі перакладзены ў XV ст., да таго ж яны не вызначалі памеры пасагу і вена, спагнанні за міжсаслоўны і нявенчаны шлюб. Мелі месца і іншыя аспекты, якія былі больш дэталёва распрацаваны ў Статутах ВКЛ.

У земскіх прывілеях таксама закраналіся пытанні шлюбу. Але нормы мала адрознівалася ад нормаў агульназемскіх прывілеяў. Прывілеі Навагарадскай зямлі 1440 г.[91], Жамойцкай зямлі 1492 г.[92] і 1507 г.[93], Полацкай зямлі 1511 г.[94]

---

[88] *Hube R.* Prawo polskie w 14 wieku. – S. 70–93.

[89] *Лазутка С.* Академическое издание I Литовского Статута // Первый Литовский Статут 1529 г. – Вильнюс, 1982. – С. 150.

[90] *Максимейко Н.* Источники уголовных законов. – С. 14–15, 105–155.

[91] *Жемайтис С.Г.* Привилей Новогрудской земле 1440 г. // Рукописные памятники: Публикации и исследования. Вып. 4. – СПб., 1997. – С. 415–425.

[92] Zbiór praw litewskich. – S. 68–69; АЗР. – Т. 1. 1340–1506. – СПб., 1846. – С. 120; *Владимирский-Буданов М.Ф.* Хрестоматия по истории русского права. Вып. 2. – Киев, 1887. – С. 53; *Kunstmanaitė J.* Provisions for Widowhood. – P. 64–65.

[93] Акты Литовской метрики (далей – АЛМ). Т. 1. – Вып. 2. 1499–1507 / Собр. Ф.И. Леонтовичем. – Варшава, 1897. – С. 198.

[94] АЗР. – СПб., 1848. Т. 2. – С. 86–90; *Пічэта У.* Полацкая зямля ў пачатку XVI сталецьця // Arche. Пачатак. 2009. – № 7. Жнівень. – С. 73–75, 109; *Лазутка С., Валиконите И., Киркене Г., Карпавичене И.* Введение // Lietuvos Metrika. Kn. 224 (1522–1530): 4-oji Teismų knyga. – P. CXVII; *Макараў М.* Ад пасада да магдэбургіі. – С. 145.

удаве надавалі права трымаць маёмасць памерлага мужа да наступнага шлюбу. Пасля ўладанні пераходзілі дзецям ці сваякам мужа[95].

Бельскі прывілей 1501 г. падрабязней асвятляе пункты адносна вена і пасагу. Калі муж не прызначыў вена, то пасля яго смерці жанчына з пасагам зыходзіла ў бацькоўскі дом. Пры атрыманні вена ад мужа, пасаг вяртаўся яе сваякам. Калі жанчына адмаўлялася гэта зрабіць, то губляла права на бацькоўскую спадчыну, але не на мацярынскую. Удава вызвалялася ад выкліку ў суд на працягу год і аднаго тыдня пасля смерці мужа. Тэрмін адмяняўся ў выніку наступнага шлюбу жанчыны[96]. Гэтыя палажэнні не ўтрымліваюцца ў іншых заканадаўчых актах.

Па Прывілеях Віцебскай зямлі 1503 і 1509 гг. забаранялася выдаваць замуж дзяўчат і жанчын пад прымусам[97], а па Прывілеі Смаленскай зямлі 1505 г. – выганяць удоў і прымушаць выходзіць замуж[98]. Прывілеі Кіеўскай зямлі 1507 г. і 1529 г.[99] паўтаралі інфармацыю пра дазвол трымаць удаве маёмасць мужа да наступнага шлюбу. Але было адзначана, што мужчына мае права запісаць жонцы грошы на частцы маёмасці, а не ўсёй маёмасці[100]. Апошняе палажэнне адрознівае прывілей ад астатніх.

На падставе вышэйпрыведзеных агульназемскіх і земскіх прывілееў можна адзначыць, што сямейнае заканадаўства пачало сваё афармленне ў ВКЛ з канца XIV ст. Гэты працэс ішоў паступова і рэгуляваў толькі некаторыя бакі сямейна-шлюбных дачыненняў, і то не ў поўнай меры. Напрыклад, вызначаны не былі памеры пасагу[101] і вена, парадак іх запісу. Аднак усе крыніцы акцэнтавалі ўвагу на тым, што шлюб павінен быць спраўленым па хрысціянскіх звычаях. Такім чынам, венчаны шлюб адзначаўся як адзіны законны шлюб.

Прывілеі закраналі толькі асобныя аспекты шлюбных дачыненняў. Паміж імі і Статутам 1529 г. нельга адзначыць суцэльнае перайманне нормаў права. Для судовай практыкі прывілееў было недастаткова, гэта відавочна дэманструе Метрыка ВКЛ. Кіраваліся звычаёвым правам і судовай практыкай.

Не менш істотны момант – выкананне заканадаўчых актаў на практыцы. Прасачыць, як яны выконваліся, не заўсёды падаецца магчымым, прыватна-

[95] *Ясинский М.Н.* Уставные земские грамоты. – С. 169–170; *Леонтович Ф.И.* Источники русско-литовского права. – С. 43, 49.

[96] Zbiór praw litewskich. – S. 84; Lietuvos Metrika. Kn. 25 (1387–1546): Užrašymų knyga 25. – P. 58; *Ясинский М.Н.* Уставные земские грамоты. – С. 94–96, 170–171, 188; *Andriulis V.* Lietuvos Statutų. – P. 88.

[97] АЗР. – Т. 1. 1340–1506. – СПб., 1846. – С. 352; *Владимирский-Буданов М.Ф.* Хрестоматия. – Вып. 2. – С. 47; Lietuvos Metrika. Kn. 25 (1387–1546): Užrašymų knyga 25. – P. 174; *Ясинский М.Н.* Уставные земские грамоты. – С. 76, 168; *Макараў М.* Ад пасада да магдэбургіі. – С. 152; *Andriulis V.* Lietuvos Statutų. – P. 89; *Kunsmanaitė J.* Provisions for Widowhood. – P. 65–67.

[98] АЗР. – СПб., 1848. – Т. 1: 1544–1587. – С. 360. *Andriulis V.* Lietuvos Statutų. – P. 89; *Kunsmanaitė J.* Provisions for Widowhood. – P. 65–67.

[99] *Ясинский М.Н.* Уставные земские грамоты. – С. 86–88; *Яковенко Н.М.* Українська шляхта з кінця XIV до середини XVII ст.: (Волинь і Центральна Україна). – К., 1993. – С. 45–47; *Andriulis V.* Lietuvos Statutų. – P. 89.

[100] АЗР. – СПб., 1848. – Т. 2. – С. 34; *Владимирский-Буданов М.Ф.* Хрестоматия. – Вып. 2. – С. 56; *Любавский М.* Областное деление. – С. 569; *Kunsmanaitė J.* Provisions for Widowhood. – P. 67–69.

[101] *Дзербіна Г.* Права і сям’я эпохі Рэнесансу. – С. 128.

прававыя акты набылі сваё распаўсюджванне з XVI ст., а падобных крыніц за папярэднія стагоддзі захавалася вельмі мала.

Значна паўплывала на Статут 1529 г. *судовая практыка*[102]. Важнасць яе вывучэння як крыніцы права адзначаў У. Пічэта, а за ім С. Лазутка[103]. Выпадкі, якія здараліся неаднаразова, паказвалі неабходнасць для ўвядзення адпаведнай нормы.

Упершыню пра ўвядзенне судоў замкавых і павятовых судоў згадваецца ў прывілеі 1397 г.[104] Больш увагі судовай сістэме і парадку вядзення судовых спраў было нададзена ў Прывілеі 1492 г. Адзначалася пра захаванне судовай улады ў ваяводаў, старостаў, дзяржаўцаў. Прызначаліся тэрміны для разгляду прыватных спраў[105]. Дадзеныя дакументы не рэгламентавалі дзейнасць судоў у поўнай меры. Судовая сістэма ў XV ст. была далёкая ад дасканаласці, большасць працэсаў разглядалася перад вялікім князем.

Дзякуючы судовай практыцы, з’явілася Устава 1509 г., якая да прыняцця Статута 1529 г. стала асноўнай нормай пры вырашэнні многіх судовых спраў, асабліва па ўдовам: у ёй быў вызначаны памер вена – 1/3 маёмасці мужа[106]. Яна выкарыстоўвалася ў судовай практыцы нават пасля прыняцця Статута 1529 г.[107], бо дадатковы артыкул, дзе быў вызначаны памер вена, з’явіўся толькі ў пашыранай рэдакцыі. Самы ранейшы – Альшэўскі спіс – датуецца 1550 г.[108]

Акрамя таго, была прынята спецыяльная Ухвала ў 1522 г., якая рэгулявала палажэнне невенаваных удоў. Паводле яе, удава атрымлівала роўную частку маёмасці з усімі дзецьмі. Яна была ўведзена ў практыку пасля разгляду справы Альжбеты Багданаўны Саковічаўны, удавы Мікалая Мікалаевіча Радзівіла, з сынамі Янам і Станіславам (1522)[109]. На гэты выпадак сталі спасылацца ў іншых справах[110]. Пасля гэтая норма ўвайшла ў Статут 1529 г.[111]

---

[102] Падрабязней судовая практыка разгледжана ў 4 і 5 раздзелах.

[103] *Пичета В.И.* Литовский Статут 1529 г. и его источники. – С. 511–514; *Лазутка С.* Академическое издание I Литовского Статута. – С. 150.

[104] *Вішнеўскі А.Ф., Юхо Я.А.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. – С. 41; Lietuvos Metrika. Kn. 25 (1387–1546): Užrašymų knyga 25. – P. 35.

[105] Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. – Т. 1. – С. 328–334; *Вішнеўскі А.Ф., Юхо Я.А.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. – С. 48; Lietuvos Metrika. Kn. 25 (1387–1546): Užrašymų knyga 25. – P. 37–43.

[106] *Daniłowicz I.* Skarbiec dyplomatów. – T. 2. – Wilno, 1862. – S. 279; РИБ. – Т. 20. Литовская метрика. – Т. 1. – Петербург, 1903. – С. 596–597; *Лазутка С., Валиконите И.* Имущественное положение женщины. – С. 84; *Kunsmanaitė J.* Provisions for Widowhood. – P. 70–71.

[107] Вяноўныя запісы Яна і Бутрыма Нямiравічаў былі прызнаныя неадпаведнымі Ухвале, бо вена перавышала 1/3 маёмасці (1541). Lietuvos Metrika. Kn. 231 (1540–1543): 12-oji Teismų bylų knyga / Parengė I. Valikonitė, N. Šlimienė, S. Viskantaitė-Saviščevienė, L. Steponavičienė. – Vilnius, 2007. – P. 68–74.

[108] Первый Литовский Статут (1529 г.) / С. Лазутка, И. Валиконите, Э. Гудавичус. – Вильнюс, 2004. – С. 103–104, 165, 353.

[109] РИБ. – Т. 20. Литовская метрика. Т. 1. – Петербург, 1903. – С. 1084.

[110] Lietuvos Metrika. Kn. 15 (1528–1538): Užrašymų knyga 15 / Parengė A.Dubonis. – Vilnius, 2002. – P. 105; Lietuvos Metrika. Kn. 224 (1522–1530): 4-oji Teismų knyga. – P. 300; Lietuvos Metrika. Kn. 25 (1387–1546): Užrašymų knyga 25. – P. 109.

[111] *Любавский М.К.* Литовско-Русский сейм. – С. 381.

Для інстытута вена дзейнічалі яшчэ іншыя нормы. Муж не меў права распараджацца самастойна маёмасцю, на якой запісана вена. Для атрымання маёнткаў ад удавы трэба было выплаціць ёй вяноўную суму. Мела месца традыцыя запісу вена з прывенкам. Адносна пасагу былі актуальныя наступныя палажэнні. Выдаваўся ён, як правіла ў рухомых рэчах. Нерухомасць вельмі рэдка прызначалася ў якасці пасагу. Дочкі атрымлівалі роўны пасаг. Калі адна з дачокпаненак памірала, то яе частка размяркоўвалася паміж сёстрамі. Выправа бяздзетнай жанчыны вярталася ў бацькоўскі дом. За межы ВКЛ дзяўчат выдавалі замуж толькі з рухомай маёмасцю[112]. Судовая практыка канца XV – пачатку XVI ст. відавочна дэманстравала неабходнасць прыняцця заканадаўчых нормаў.

Такім чынам, да ўвядзення Статута 1529 г. шлюбныя дачыненні рэгуляваліся звычаёвым правам, агульназемскімі і земскімі прывілеямі і судовай практыкай. Назапашаны вопыт быў пасля выкарыстаны ў артыкулах зводу законаў.

## Унармаванне шлюбных і пазашлюбных стасункаў у Статутах ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг.

У пачатку XVI ст. у шляхецкім грамадстве наспявае неабходнасць у кадыфікацыі права[113]. Згадка аб намеры кадыфікаваць права была змешчана ў прывілеі Валынскай зямлі ў 1501 г. На сойме 1514 г. упершыню прагучала просьба аб стварэнні заканадаўчых актаў. Яна паўтарылася ў 1522 г. на Гарадзенскім сойме. Абмеркаванне Статута было на віленскіх соймах 1522 і 1523 гг. Але канчатковае прыняцце Статута адбылося ў 1528–1529 гг.[114]

Выданне *Статута 1529 г.*[115] вывела ВКЛ на адно з першых месцаў у Еўропе па развіцці права і прававой культуры. Першы Статут утрымліваў два асноўныя раздзелы (4, 5) па сямейным праве, што падняло гэтую галіну праву на прынцыпова іншы ўзровень. Асноўная ўвага надавалася маёмасным дачыненням у сям’і. Артыкулы адносна шлюбных дачыненняў пасагу і вена прадстаўлялі сур’ёзную юрыдычную распрацоўку.

---

[112] Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków w Sławucie. – T. 3. 1432–1534. – Lwów, 1910. – S. 9–11; РИБ. – Т. 20. Литовская метрика. – Т. 1. – Петербург, 1903. – С. 33–34, 390–391, 498–500, 605–607, 1105–1106, 1108–1109, 1179–1180, 1211–1214 і інш.

[113] *Чарнецкий*. История Литовского Статута. – № 10. – С. 4–9; *Пичета В.И.* Литовский Статут 1529 г. и его источники. – С. 507–508; *Бардах Ю.* Литовские Статуты – памятники права периода Возрождения // Культурные связи народов Восточной Европы в XVI в. Проблемы взаимоотношений Польши, России, Украины, Белоруссии и Литвы в эпоху Возрождения / Под ред. Б.А. Рыбакова. – Москва, 1976. – С. 72.

[114] *Чарнецкий*. История Литовского Статута. № 10. – С. 9–12; *Максимейко Н.А.* Сеймы Литовско-Русского государства до Люблинской унии 1569. – Харьков, 1902. – С. 142; *Bardach J.* Statuty litewskie jako wyraz kultury prawnej. – S. 309; *Godek S.* Elementy prawa rzymskiego w III Statucie litewskim. – S. 28–29.

[115] Спіскі Статута 1529 г. аналізаваліся ў гістарыяграфіі і некаторыя выдадзены факсімільна. *Daniłowicz I.* Rzut oka historyczny na prawodawstwo litewskie. 2. – S. 237; Первый Литовский Статут (1529 г.) / С. Лазутка, И. Валиконите, Э. Гудавичус. – Вильнюс, 2004. – С. 69–125; *Лазутка С.* Первый Литовский Статут (1529 г.). Палеография и факсимиле рукописей списков Замойских и Фирлейского. – Вильнюс, 2007.

Статут вызначаў узрост дасягнення паўналецця – для хлопчыкаў 18 год, дзяўчынак 15 год (Статут 1529 г. Р. 1. Арт. 18)[116]. З гэтага ўзросту наступала не толькі юрыдычная адказнасць, але і дазвалялася браць шлюб. Хаця ў судовай практыцы да прыняцця Статута паўналецце для хлопчыкаў вызначалася з 15 год[117]. Для дзяўчат узрост вызначаўся рэпрадуктыўнымі магчымасцямі, а для хлопцаў патрабавалася фізічная і інтэлектуальная сталасць. Таму ў заканадаўстве паўналецце вызначалася гендэрнай прыналежнасцю[118]. Гэты падыход захаваўся і ў наступных Статутах.

Адным з важных раздзелаў быў 4-ы, які датычыўся выдачы замуж дзяўчат і парадку атрымання імі спадчыны. У адрозненне ад прыватна-прававых крыніц, у Статуце дакладна размяжоўвалі тэрміны «пасаг» і «вена»[119]. Статут не ўтрымлівае дакладнага вызначэння тэрміна «пасаг». На падставе згаданых артыкулаў можна адзначыць, што ён складаўся з сукупнасці рухомай і нерухомай маёмасці. У адносінах да бацькоў ці апекуноў выкарыстоўваецца тэрмін «выправа». Тэрмін «унясенне» ў Статуце з'явіўся ў пазнейшых спісах. Ён ужываўся таксама ў Метрыцы ВКЛ у адносінах да сям'і мужа, якой была ўнесена маёмасць. Памеры пасагу былі, як правіла, меншыя за часткі спадчыны, якія атрымлівалі сыны. Выклікана гэта было жаданнем шляхты ўтрымліваць і перадаваць маёмасць па мужчынскай лініі, а таксама было звязана з выкананнем земскай службы з маёнткаў[120].

Незалежна ад таго, колькі дачок было ў сям'і: адна ці тры і болей, на ўсіх разам прыходзілася 1/4 уладанняў бацькі[121]. Паміж дзяўчынамі маёмасць размяркоўвалася аднолькава (Статут 1529 г. Р. 4. Арт. 7)[122]. Заканадаўства трактавала пасаг як спадчыну жанчыны[123]. Акрамя таго, ён быў важным маёмасным аспектам шлюбу, даваў дзяўчыне забеспячэнне і статус у новай сям'і. У гістарыяграфіі існуе меркаванне, што пасаг быў часткай маёмасці новай сям'і[124]. Аднак пасаг цалкам належаў жанчыне, і яна магла падараваць яго любой асобе. Тое, што пасаг уносіўся ў дом мужа, не азначала, што апошні распараджаўся

---

[116] *Дзербіна Г.* Права і сям'я эпохі Рэнесансу. – С. 113.

[117] РИБ. – Т. 20. Литовская метрика. Т. 1. – Петербург, 1903. – С. 1039–1040.

[118] *Andriulis V.* Lietuvos Statutų. – P. 41–44.

[119] *Любавский М.* Областное деление и местное управление. – С. 573.

[120] *Скитский И.И.* Невенованые вдовы по Литовскому Статуту. – С. 42; *Лазутка С., Валиконите И.* Имущественное положение женщины. – С. 86–88; *Лазутка С., Валиконите И., Карпавичене И.* Введение // Lietuvos Metrika. Kn. 225 (1528–1547): 6-oji Teismų knyga. – P. LXXIX.

[121] І. Даніловіч звязвае абмежаванне выдзяленне пасагу толькі з чацвёртай часткі маёмасці з абавязкам шляхты несці вайсковую службу: *Данилович И.* Взгляд на литовское законодательство. – С. 37.

[122] Пасля прыняцця Статута 1529 г. гэтай нормай кіраваліся ў судах. Блажэйна Жыхоўскі і яго жонка Дарота прэтэндавалі на частку бацькоўскай маёмасці. Яе брат, Ян Кавалевіч, аргументаваў, што няма такога звычаю – аддаваць нерухомую маёмасць дзяўчыне. Суд прыняў рашэнне, што брат павінен выплаціць 1/4 ад маёмасці (1529). Lietuvos Metrika. Kn. 225 (1528–1547): 6-oji Teismų knyga / Parengė S. Lazutka, I. Valikonitė. – Vilnius, 1995. – P. 104. Аб гэтым сведчаць і іншыя прыклады.

[123] *Dąbkowski P.* Dobra rodowe i nabyte w prawie litewskim od XIV do XVI wieku. – Lwów, 1916. – S. 22.

[124] *Лазутка С., Валиконите И.* Имущественное положение женщины. – С. 90.

маёмасцю жонкі[125]. Толькі па даравальным запісе рухомыя і нерухомыя рэчы маглі стаць уласнасцю мужа. Самавольны захоп прыводзіў да судовых скаргаў.

Пры выдачы дачкі замуж у іншую краіну пасаг выдаваўся грашыма. Родныя браты ці сёстры, а калі іх не было, то сваякі, павінны былі выплаціць пасаг, а маёмасць пакінуць сабе (Статут 1529 г. Р. 4. Арт. 9)[126]. Артыкул замацоўваў норму з прывілея 1492 г., якім кіраваліся ў судовай практыцы.

Выкананне гэтага артыкула адсочвала шляхта. Калі ўдава па падскарбію ВКЛ Міхаілу Богушу Багавіцінавічу – Фядора Андрэеўна Сангушкаўна – без згоды апекуноў заручыла дачку Ганну з кракаўскім ваяводам Станіславам Цянчынскім[127], гэта выклікала негатыўную рэакцыю шляхецкага грамадства. У пасольскіх наказах вялікаму князю літоўскаму 1538 г. была просьба не даваць пасаг з маёнткаў дзяўчыне, якая замуж выходзіць у іншую краіну пад зарукай 10 000 коп літоўскіх грошаў. Абставіны справы былі наступныя. У М. Багавіцінавіча не было нашчадкаў мужчынскага полу, толькі дочкі – Ганна, Фядора і Ульяна. Паміж імі была размеркавана маёмасць[128]. Ф. Сангушкаўна выдала замуж дачку за іншаземца. Але яе віна заключалася ў тым, што шляхцянка не выставіла ваяроў на службу са сваіх маёнткаў і маёнткаў дачок. Шляхта ВКЛ патрабавала выплаты зарукі і пакарання ўдавы. Акрамя таго, былі згаданы палякі (Урэмеўскі, Скарута, Апароўскі, Свяціцкі і інш.), якія пабраліся шлюбам з шляхцянкамі з ВКЛ, а службу не выконвалі, чым наносілі шкоду краіне. У адказе Жыгімонта Аўгуста адзначалася, што гаспадар ва ўсім кіруецца Статутам, згодна з якім Ф. Сангушкаўну не трэба вызваляць ад зарукі. У абавязак Панам Радзе ўводзілася абвесціць сваякам Багавіцінавіча пра прызначэнне тэрміну для аддання пасагавых грошай Цянчынскаму. Ён меў права трымаць маёмасць жонкі да выплаты яму грошай. Адносна ўдоў, якія вышлі замуж за палякаў, было адзначана, што яны нічым не парушаюць заканадаўства. Аднак вайсковая служба для іх была абавязковай, а калі яна не выконвалася, то санкцыі павінны ўжывацца па заканадаўстве[129].

На сойме 1551 г. шляхта ВКЛ падала ліст да Жыгімонта Аўгуста, у якім быў шэраг просьбаў[130]. Сярод іх – просьба аб пазбаўленні маёмасці і шляхецтва дзяўчыны ў выпадку яе шлюбу з іншаземцам. Калі яна атрымала дазвол на

[125] *Dąbkowski P.* Dobra rodowe i nabyte. – S. 99–100.

[126] *Спасович В.Д.* Об отношениях супругов. – С. 153–154; *Dąbkowski P.* Dobra rodowe i nabyte. – S. 26, 100; *Валиконите И.М.* I Литовский Статут – один из важнейших источников истории положения женщин в Великом Княжестве Литовском // Первый Литовский Статут 1529 г. – Вильнюс, 1982. – С. 40; *Andriulis V.* Lietuvos Statutų. – P. 63.

[127] *Uruski S.* Rodzina. Herbarz szlachty polskiej. – T. 1. – Warszawa, 1904. – S. 289; T. 14. – Warszawa, 1917. – S. 352.

[128] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные археографическою комиссиею (далей – АЮЗР). – Т. 1. 1361–1598. – СПб, 1863. – С.75–77; *Сліж Н.* Як вярнуць збеглую жонку: прыгоды з жыцця Ульяны Гарнастаевай з роду Багавіцінавічаў (?–1575) // Homo Historicus. 2008. – S. 78–91.

[129] АЮЗР. – Т. 1. 1361–1598. – СПб., 1863. – С. 86–89; *Любавский М.К.* Литовско-Русский сейм. – С. 274–275, 280.

[130] *Любавский М.К.* Литовско-Русский сейм. – С. 551–558; *Спасович В.Д.* Об отношениях супругов. – С. 154; *Любавский М.К.* Очерк истории Литовско-Русского государства. – С. 233–238.

шлюб, то ёй выдзялялі толькі грошы, а нерухомая маёмасць заставалася ў сям'і. У адказе гаспадара было адзначана, што ў гэтым пытанні павінны прытрымлівацца нормаў Статута. Гэта азначала, што гаспадар не пагадзіўся пазбаўляць шляхецтва, бо гэта зрабіла б яшчэ больш жорсткімі санкцыі адносна прадстаўніц жаночага полу. Па Статуце дзяўчыну пазбаўлялі нерухомай маёмасці, але яе статус не паніжалі. На сойме 1554 г. была выказана просьба адносна ўдоў, якія выходзяць замуж за мяжу і маёнткі аддаюць ў заставу сваім сужэнцам, чым робяць шкоду для вайсковай службы. Шляхта настойвала, каб іх застаўныя запісы не мелі моцы. Таксама выказвалася просьба аб магчымасці выкупу маёмасці сваякамі, калі дзеўкі замуж выходзілі за мяжу. У сваім адказе Жыгімонт Аўгуст спаслаўся на Статут і пацвердзіў, што ў дадзеным выпадку дзяўчыне выдаюць пасаг грашыма і рухомымі рэчамі, а маёмасць застаецца ў сваякоў[131]. Прадстаўленне такой просьбы на сойме 1554 г. магло адзначаць парушэнне на практыцы нормаў Статута і існаванне магчымасці абысці іх праз заставу маёмасці. Пазней, паводле Ухвалы 1563 г., мужчына, які быў прыняты ў дом удавы ці панны ў якасці мужа, быў абавязаны несці вайсковую службу[132].

Замуж дзяўчына магла выйсці толькі са згоды бацькоў, а калі яны памерлі, то апекуноў, інакш яна пазбаўлялася пасагу і спадчыны. У выпадку перашкоды апекуноў ўзяць шлюб дзяўчына мела права звярнуцца да ўладаў (Статут 1529 г. Р. 4. Арт. 10, 11)[133]. Пры гэтым заканадаўства пакідала права за шляхцянкамі добраахвотна, без прымусу выходзіць замуж[134] (Статут 1529 г. Р. 4. Арт. 15). Гэта азначае, што воля жанчыны ці дзяўчыны ўлічвалася, нават калі гэта насіла фармальны характар[135]. Згоду на шлюб у дзяўчыны маглі запытаць у судзе ў сітуацыях, калі сумняваліся ў добраахвотнасці шлюбу[136]. Калі зыходзіць з летапіснага выпадку – звароту Рагвалода да дачкі Рагнеды з пытаннем пра шлюб з Уладзімірам[137], то гэтая традыцыя мае старажытныя карані. Аднак агульназемскія і земскія прывілеі прадпісвалі выдаваць замуж асобаў жаночага полу без прымусу, што перайшло ў норму Статута. Але за самавольны шлюб дзяўчыне прызначалася пакаранне, што паказвае на пэўнае абмежаванне яе рашэння[138]. Пры гэтым за прымушэнне да шлюбу супраць бацькоў ці сваякоў не ўжываліся спагнанні.

---

[131] Biblioteka Kórnicka. Rkps. 804. K. 184-184v; АЗР. – СПб., 1848. – Т. 3: 1544–1587. – С. 37, 53; *Любавский М.К.* Литовско-Русский сейм. – С. 581.

[132] АЗР. – Т. 3. 1544–1587. – СПб., 1848. – С. 124; *Любавский М.К.* Литовско-Русский сейм. – С. 639–640.

[133] *Пичета В.И.* Земельное право в Статутах 1529 и 1566 г. // Белоруссия и Литва XV–XVI вв. – Москва, 1961. – С. 477.

[134] *Лаппо И.И.* Великое княжество Литовское. – Т. 1. – С. 519; *Таўталес А.* Права сямейнае паводле Літоўскіх Статутаў // Arche. Пачатак. – 2009. № 7. Жнівень. – С. 990.

[135] *Валиконите И.М.* Социально-экономическое и правовое положение женщин. – С. 110–111.

[136] Архив Юго-Западной России, издаваемый временною комиссиею для разбора древних актов, высочайше учрежденною при Киевском Военном, Подольском и Волынском генерал-губернаторе (далей – Архив ЮЗР). Ч. 8. Т. 3. – Киев, 1909. – С. 122–133, 179–180.

[137] *Загоровский А.* О разводе по русскому праву. – Харьков, 1884. – С. 14.

[138] *Лазутка С., Валиконите И., Киркене Г., Карпавичене И.* Введение // Lietuvos Metrika. Kn. 224 (1522–1530): 4-oji Teismų knyga. – P. CXVII.

На віленскім сойме 1551 г. была прынята пастанова, якая абмяжоўвала дзеянне артыкулу 11. Паводле яго, удава не мела права сама выдаваць дачок без згоды сваіх дарослых сыноў. Калі іх не было, то без згоды сваякоў па мужчынскай лініі, а калі іх няма, то без згоды сваіх сваякоў. У выпадку адсутнасці згоды паміж імі і маці з-за шлюбу справу разглядалі перад гаспадаром, Панамі Радай ці ваяводамі. Гэтая пастанова прывяла да злоўжывання. Карыстаючыся сітуацыяй сваякі не спяшаліся выдаваць замуж сірот, каб распараджацца іх маёмасцю, ці выдавалі прымусова. У сувязі з гэтым на сойме 1554 г. была выказана просьба скарэкціраваць пастанову і вярнуцца да старога звычаю, калі маці ці прызначаныя ў тэстаменце апекуны выдавалі замуж[139].

Бацька ці апякун нявесты абавязаны быў паклапаціцца, каб муж запісаў ёй вена перад шлюбам (Статут 1529 г. Р. 4. Арт. 8). Яшчэ да прыняцця Статута ў звычаёвым праве, судовай практыцы і Ухвале 1509 г. быў вызначаны запіс вена на 1/3 маёмасці мужа. За ўнесены пасаг шляхцянка атрымлівала падвоеную суму грошай, якая складалася з пасагу і прывенка. Тым не менш у першай рэдакцыі Статута 1529 г. няма артыкула, які б дакладна вызначаў памер вена. Адзначалася толькі, што пры неадпаведным афармленні вена жанчына губляла вянец (Статут 1529 г. Р. 4. Арт. 3, 8)[140]. Норма з’явілася толькі ў пашыранай рэдакцыі[141]. Тадэвуш Чацкі слушна звярнуў увагу на тое, што гэты артыкул рэгуляваў адну з галоўных умоў шлюбу[142]. Пасля прыняцца Статута вена сталі афармляць пасля вяселля (1546)[143].

Маёмасць, на якой было запісана вена, прыраўноўвалася да застаўной[144]. Муж без дазволу жонкі не мог прадаць, заставіць, абмяняць маёмасць[145]. Аднак у Статуце не быў вызначаны фармуляр вяноўнага запісу. Ён быў выпрацаваны судовай практыкай. Гэта ілюструюць запісы Метрыкі ВКЛ за 50-я гг. XVI ст.

Замуж дзяўчына магла выйсці і пры надзвычайных абставінах – праз гвалт. За згвалтаванне прадугледжвалася пакаранне смерцю. Толькі згода дзяўчыны на шлюб са злачынцам выратоўвала яго ад смяротнага прысуду. Знакам супраціву падчас гвалту быў крык. Калі на шум не прыбеглі людзі, то пацярпелая павінна была адразу, пасля таго як яе адпусцілі, распавесці пра злачынства і паказаць знакі гвалту (Статут 1529 г. Р. 7. Арт. 6)[146]. Гэтыя справы былі ў кампетэнцыі

---

[139] АЗР. – СПб., 1848. – Т. 3: 1544–1587. – С. 58; *Любавский М.К.* Литовско-Русский сейм. – С. 569; *Максимейко Н.А.* Сеймы Литовско-Русского государства. – С. 142–143.

[140] *Лазутка С., Валиконите И.* Имущественное положение женщины. – С. 90–93; *Valikonytė I.* The Venets of Noblewomen in the Grand Duchy of Lithuania. – P. 97–107.

[141] *Валиконите И.М.* I Литовский Статут – один из важнейших источников истории положения женщин. – С. 40.

[142] *Czacki T.* O litewskich i polskich prawach, o ich duchu, źródłach, związku, i o rzeczach zawartych w pierwszym Statucie dla Litwy, 1529 roku wydanym. – T. 2. – Kraków, 1861. – S. 11, 53.

[143] Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кн. 30 (1480–1546) / Падрыхт. В.С. Мянжынскі. – Мінск, 2008. – С. 123–124.

[144] *Dąbkowski P.* Dobra rodowe i nabyte. – S. 98–99.

[145] *Лазутка С., Валиконите И.* Имущественное положение женщины. – С. 93–95.

[146] *Малиновский И.А.* Учение о преступлении по Литовскому Статуту. – Киев, 1894. – С. 55–56; *Валиконите И.М.* I Литовский Статут – один из важнейших источников истории положения женщин. – С. 45.

ваяводаў і старостаў[147]. Згвалтаванне дыскрэдытавала жанчыну і яе сям'ю. Выйсцем быў шлюб з гвалтаўнікам. На той час яшчэ мог існаваць такі перажытак, як узяцце шлюбу праз гвалт. Ян Ласіцкі і Паўль Одэрборн пры апісанні шлюбнага абраду ў ВКЛ адзначалі, што пазбаўленне дзявоцкасці прымушала незгаворлівых бацькоў пагаджацца на шлюб[148]. Гэта таксама магло прымусіць пакінуць у Статуце выбар для злачынцы паміж шлюбам і смерцю. Але калі жанчына была замужам, то ў гвалтаўніка было толькі адно выйсце – смерць.

Згвалтаванне ў заканадаўстве многіх краін лічылася цяжкім злачынствам, за якое якое прадугледжвалася смяротнае пакаранне[149]. Яно трактавалася як гвалт волі жанчыны, які прыводзіў да парушэння спакою яе сям'і і грамадства, да знявагі звычаяў[150], замаху на сямейную маёмасць, напрыклад, як у мазавецкім праве[151]. Згвалтаванне як злачынства згадвалася ў сярэднявечных крыніцах польскага права. У іх таксама звяртаецца ўвага на крык аб дапамозе як неабходную ўмову сведчання пра гвалт[152]. Падобны артыкул быў у Вісліцкім Статуце[153]. Ён утрымліваў інфармацыю пра абставіны гвалту (крык, знакі гвалту), несправядлівае абвінавачванне ў згвалтаванні. Пра шлюб з гвалтаўнікам нічога не адзначалася.

Цяжка дакладна вызначыць ці была перанята норма пра шлюб з гвалтаўнікам, ці існавала ў звычаёвым праве. Вядома, што Вестгоцкая Праўда (654 г.) дазваляла ўзяць шлюб з гвалтаўнікам, калі бацькі не былі супраць[154]. Ідэю шлюбу з гвалтаўнікам прапагандаваў з даўніх часоў касцёл. Рашэнне належала да ахвяры[155]. Аднак у судовай практыцы была праблема даказаць гвалт[156].

---

[147] РИБ. – Т. 20. Литовская метрика. Т. 1. – Петербург, 1903. – С. 665; *Лаппо И.И.* Великое княжество Литовское. – С. 291.

[148] (*Łasicki J.* De Russorom Moskovitarum et Tartarorum religiona, sacrificiis, nuptiarum, runerum ritu. Spirae, 1582. – P. 241–245). *Ласіцкі Я.* [Шлюбныя звычаі на Беларусі ў XVI стагоддзі] // Вяселле: Абрад / Уклад., уступ. Арт. і камент. К.А. Цвіркі; Муз. дадат. З.Я. Мажэйка; Рэд. В.К. Бандарчык, А.С. Фядосік. 2-е выд. – Мінск, 2004. – С. 38–39; *Oderborn P.* De Russorum religione, ritibus nuptiarum, funerum, victu, vestitu, &c. et de Tartarorum religione ac moribus: vera et luculenta Narratio. Ad D. Davidem Chytraeum recens scripta. [Rostock] Excudebat Stephanus Myliander, 1582. – P. Bv-B2; *Одэрборн П.* Праўдзівы і грунтоўны аповед пра веру русаў // Беларускі гістарычны агляд. 2005. – Том 12. Сшыткі 1–2 (22–23). – С. 167–189.

[149] *Koranyi K.* O niektórych postanowieniach karnych Statutu Litewskiego z r. 1529. Studium prawno-porównawcze // Księga pamiątkowa ku uczczeniu czterechsetnej rocznicy wydania pierwszego Statutu Litewskiego. – Wilno, 1935. – S. 149–154; *Krawiec A.* Seksualność w średniowiecznej Polsce. – Poznań, 2000. – S. 151–152.

[150] *Czacki T.* O litewskich i polskich prawach. – S. 138–139.

[151] *Krawiec A.* Seksualność... – S. 178–179.

[152] Артыкулы аб згвалтаванні ўтрымлівалі Эльбланская кніга, Мазавецкае права, Статут Казіміра Вялікага. *Koranyi K.* O niektórych postanowieniach karnych Statutu. – S. 149–154; *Krawiec A.* Seksualność... – S. 168–203.

[153] АЮЗР. Т. 1. 1361–1598. – СПб., 1863. – С. 11, 18; *Максимейко Н.* Источники уголовных законов. – С. 116–117.

[154] *Brudage J.A.* Law, Sex, and Christian Society in Medieval Europe. – Chicago; London, 1987. – P. 133.

[155] *Koranyi K.* O niektórych postanowieniach karnych Statutu. – S. 151–152.

[156] Парабак Цікан абвінаваціў у згвалтаванні сваёй дачкі Нядзелькі свіслацкага мешчаніна Юрыя Вінніка. Але з-за адсутнасці трох сведак быў прызнаны невінаватым, хоць пра выпадак дзяўчына распавяла жонцы войта і іншым жанчынам (1537). Пры вынясенні прысуду суддзі

Асобныя артыкулы былі прысвечаны ўдаве (Статут 1529 г. Р. 4. Арт. 1–6)[157]. Пасля смерці мужа жанчына распараджалася сямейнай маёмасцю і апекавалася дзецьмі. Пры адсутнасці тэстамента сужэнца заканадаўства прызнавала за ёй першаснае права на апеку над дзецьмі і маёмасцю. Яна атрымлівала роўную частку маёмасці для пажыццёвага трымання пры падзеле з усімі дзецьмі, калі ёй не было запісана вена. За нядбайны дагляд шляхцянка адхілялася ад кіравання маёнткамі і выхавання. Дзецьмі апекаваліся самыя блізкія сваякі, у першую чаргу – дзядзькі па лініі бацькі. Заставацца на ўдовіным стольцы яна магла, пакуль не выходзіла замуж. Удава, якая мела дарослых сыноў, гаспадарыла толькі на сваёй частцы маёмасці і не мела права перашкаджаць сынам карыстацца спадчынай і несці службу[158]. Яна захоўвала за сабой вена пры ўмове, што яно было адпаведна аформлена. Калі ў мужа канфіскоўвалі маёмасць за нейкае злачынства, вена заставалася за жанчынай пры ўмове, што яна не мела дачынення да правапарушэння (Статут 1529. Р. 5. Арт. 10). Па заканадаўстве жанчыне гарантавалася вена і магчымасць пажыццёвага карыстання маёмасцю[159], нават калі не было адпаведнага запісу мужа. У такім выпадку яна губляла толькі прывенак, але не заставалася без месца жыхарства.

Упершыню Статут уводзіў тэрмін «бенкарт» – пазашлюбнае дзіця, ад якога адмовіўся бацька ці напісаў гэта ў сваім тэстаменце, альбо народжанае ад нявенчанай жонкі. Аднак сын, які прызнаваўся ў законным шлюбе, калі яшчэ жыла маці, заставаўся законным сынам і пры мачысе[160]. Артыкул ускосным чынам згадвае пра існаванне нявенчанага шлюбу, але не забараняе яго наўпрост. Дыскрымінацыйны статус атрымліваюць дзеці, народжаныя ў такім шлюбе. Тым не менш першы Статут не змяніў тут істотна сітуацыю. Сустракаліся выпадкі прызнання дзяцей ад нявенчаных шлюбаў законнымі і пасля прыняцця Статута 1566 г. На гэта меў права манарх, што адзначаў папскі нунцый Фульвюс Ругеры (1565)[161]. Напрыклад, лістом ад 31 жніўня 1583 Стэфан Баторый прызнаў незаконнанароджанага Івана Маргонскага законным сынам яго бацькоў – Фамы Маргонскага і Барбары Паўлоўскай[162].

Першы Статут меў важнае значэнне для ўнармавання шлюбных аносінаў. Былі вызначаны: шлюбны ўзрост, парадак выдзялення пасагу і афармлення вена,

---

кіраваліся нормамі Статута 1529 г. Судебная книга витебского воеводы, господарского маршалка, волковысского и оболенского державцы М.В. Клочко. 1533–1540 (Литовская метрика. Книга № 228. Книга судных дел № 9 / [публ. подг. В.А. Воронин, А.И. Груша, И.П. Старостина, А.Л. Хорошкевич; отв. ред. А.Л. Хорошкевич, Г.Я. Голенченко]). – М., 2008. – С. 96–97.

[157] *Скитский И.И.* Невенованные вдовы по Литовскому Статуту. – С. 39–41; *Таўталес А.* Права сямейнае. – С. 995; *Kunstmanaitė J.* Provisions for Widowhood. – P. 86–87.

[158] *Czacki T.* O litewskich i polskich prawach. – S. 9–11; *Лазутка С., Валиконите И.* Имущественное положение женщины. – С. 95–97; *Любавский М.* Областное деление и местное управление. – С. 571.

[159] *Лазутка С., Валиконите И.* Имущественное положение женщины. – С. 98; *Kunstmanaitė J.* Provisions for Widowhood. – P. 85.

[160] Статут 1529. Р. 3. Арт. 12.

[161] [*Rekaczewski E.*] Relacye nuncyuszów apostolskich i innych osób o Polsce od roku 1548 do 1690. – T. 1. – Berlin; Poznań, 1864. – S. 125–126.

[162] Описание рукописного отдела Виленской публичной библиотеки. Вып. 3. – Вильна, 1898. – С. 17.

статус удавы, нявенчаны шлюб. Многія нормы звычаёвага права і судовыя выпадкі сталі заканадаўчымі нормамі.

Для развіцця прыватна-прававых дачыненняў мелі значэнне наступныя пастановы. На Віленскім сойме 1529 г. было прынята рашэнне пра правядзенне штогод у Вільне судовага сойму Паноў Рады для разбору спрэчак. Паводле Уставы 1542 г., шляхта павінна была вырашаць судовыя працэсы па месцы знаходжання маёнткаў перад ваяводамі ці старостамі. Гэтая норма была пацверджана на Берасцейскім 1544 г. і на Віленскім 1547 г. соймах[163]. Гэта спрыяла развіццю судовай сістэмы ў паветах і вырашэнню там спрэчных сямейных спраў, у тым ліку і па шлюбных дачыненнях. Пастанова Віленскага сойма 1551 г. абавязвала запісы на вечнае карыстанне маёмасцю, даравальныя запісы і акты куплі-продажу ўносіць у кнігі ваяводаў, старостаў ці прызнаваць перад павятовымі суддзямі. Выпісы выдаваліся па жаданні. Але гэта не датычылася пазыковых запісаў і запісаў на рухомыя рэчы[164]. У Статуце 1529 г. падобнага артыкула не было. У судовыя кнігі сталі ўносіць не толькі згаданыя дакументы, але і вяноўныя запісы, разводныя лісты.

Яшчэ да прыняцця згаданых пастаноў мясцовыя суды дзейнічалі на Падляшшы. Не менш важным прыкладам вядзення лакальнага справаводства сталі магістраты. З судовай справы віленскага мешчаніна Лукаша Мажэйковіча і яго зяця Балтрамея з ковенскім войтам, бурмістрам і радцамі вынікае, што ў Коўна вяліся магістрацкія кнігі, у якіх занатоўваліся дакументы па маёмасных справах (1486)[165]. Канфлікт паміж залатаром Вельфканкам і віленскім магістратам паказвае, што ўжо быў усталяваны парадак складання тэстаментаў (1522)[166]. Справаводства пачалі ўпарадкоўваць у староствах і на гаспадарскіх дварах. Упершыню ва ўставе для Жамойцкага староства было загадана весці судовыя запісы (1527)[167].

Паступова дзяржава прыходзіла да неабходнасці ўпарадкавання вядзення дакументацыі ў розных структурах улады. Увядзенне Статута 1529 г. спрыяла развіццю прававой сістэмы і судовай улады. Перадача паўнамоцтваў лакальным судам прыводзіла да таго, што большасць прыватных спраў разглядалася на месцы. Гэта пашырала судовую практыку, давала магчымасць выправіць хібы ў артыкулах і ўнесці ў наступны Статут дапрацаваныя нормы.

---

[163] АЗР. – Т. 2. 1506–1544. – СПб., 1848. – С. 389–390; Zbiór praw litewskich. – S. 411; АЗР. – Т. 3. 1544–1587. – СПб., 1848. – С. 9–10; *Любавский М.К.* Литовско-Русский сейм. – С. 287, 298–299, 309.

[164] АЗР. – СПб., 1848. – Т. 3: 1544–1587. – С. 33–34; *Максимейко Н.А.* Сеймы Литовско-Русского государства. – С. 142.

[165] АЛМ. – Т. 1. – Вып. 1. 1413–1498. – Варшава, 1896. – С. 22–23.

[166] РИБ. – Т. 20. Литовская метрика. Т. 1. – Петербург, 1903. – С. 1041–1044.

[167] АЗР. – Т. 2. 1506–1544. – СПб., 1848. – С. 199–203; *Довнар-Запольский М.В.* Государственное хозяйство Великого княжества Литовского при Ягеллонах. – Т. 1. – Киев, 1901. – С. 267–273; *Pociecha W.* Królowa Bona (1494–1557). Czasy i ludzi odrodzenia. – T. III. – Poznań, 1949. – S. 69–78.

Перад тым як прадставіць аналіз артыкулаў другога і трэцяга Статутаў, звернем увагу на асобнікі зводаў законаў. Вывучаліся рукапісы[168] Статута 1566 г.[169] Асобнікі Статутаў цікавы не толькі сваім зместам, але і каментарамі, заўвагамі, якія змешчаны побач з артыкуламі. Гэта дадатковая інфармацыя па карыстанні праўнікамі зводамі законаў. Больш каментароў змяшчаецца ў экзэмплярах Статута 1588 г., бо ён дзейнічаў значна большы перыяд часу, шэраг разоў перавыдаваўся.

Першыя выданні Статута 1588 г. хутка разышліся. Яны былі неабходныя для карыстання ў судовых установах і асабіста для шляхты[170]. Становяцца актуальнымі яго наступныя перавыданні. З ініцыятывы Льва Сапегі Статут быў перакладзены на польскую мову. Пры яго жыцці пабачылі свет выданні ў 1614, 1619 гг. Пазней Статут перавыдаваўся ў 1648, 1693, 1744, 1768 гг. Перавыданні дапаўняліся соймавымі пастановамі, у тым ліку і новым[171]. Даследчыкі адзначаюць пра наяўнасць перавыданняў, але па-за іх увагай засталіся карэктуры, заўвагі на палях, дадаткі з канстытуцый.

Выданне 1614 г.[172] з'яўлялася толькі перакладам і не ўтрымлівала каментароў[173]. Перавыданне 1619 г.[174] уяўляла ўжо сабой не толькі пераклад, але і

[168] Рукапісы Статута 1566 г. захоўваюцца ў розных калекцыях: Biblioteka Kórnicka. Rkps. 818, 2710; Biblioteka Narodowa. Rkps. IV. 3075; Biblioteka Czartoryskich. Rkps. 1423 і інш. друкаваныя выданні: Статут Великого князьства Литовского 1566 года и поправы статутовые 1578 года // Временник Московского о-ва истории и древностей российских. 1855. Кн. 23. – С. 1–242; Archiwum Komisyi prawniczej. – Т. 7. – Kraków, 1900; Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года. – Мінск, 2003.

[169] *Daniłowicz I.* Rzut oka historyczny na prawodawstwo litewskie. – S. 237–238; *Лазутка С., Василяускене А.* Списки второго Литовского Статута на старопольском языке // Третий Литовский Статут 1588 г. Материалы Республиканской научной конференции, посвященной 400-летию Третьего Статута. – Вильнюс, 1989. – С. 106–125; *Василяускене А.В.* Списки второго Литовского Статута на старобелорусском языке (палеография, хронология, дипломатика). / Автореф. дис. ... канд. истор. наук: 07.00.02 / Вильн. ун-т. – Вильнюс, 1990.

[170] Статут Великого Княжества Литовского. – Вильно, 1588. У аддзеле старадрукаў захоўваюцца два экзэмляры Статута. Адзін у добрым стане (BN XVI. F. 561.), другі (BN. XVI. F. 612.) – без пачатка, але са шматлікімі запісамі на палях. Katalog druków cyrylickich w zbiórach biblioteki Narodowej / Oprac. Z. Żurawińska, Z. Jaroszewicz-Peresławcew. – Warszawa, 2004. – S. 28–29. Апісанне гэтага выдання гл.: *Лаппо И.И.* Литовский Статут 1588 г. Т. 1. Исследование. Ч. 2. – Каунас, 1936. – С. 310–329, 366–398, 406. Даследаванне кірылічных выданняў Статута 1588 г. з'яўляецца важным накірункам у гістарыяграфіі. *Daniłowicz I.* Opisanie bibliograficzne dotąd znanych exemplarzy Statutu Litewskiego, rękopiśmiennych i edycji drukowanych, tak w ruskim oryginalnym, jako też w polskim i łacińskim języku // Dziennik Wileński. – 1823. – T. 2. – S. 168–177; *Дубонис А.* Исследования экземпляров Третьего Литовского Статута // Третий Литовский Статут 1588. Материалы Республиканской научной конференции, посвященной 400-летию Третьего Статута. – Вильнюс, 1989. – С. 241–248.

[171] *Linde S.B.* O Statucie Litewskim ruskiem językiem pisanym i drukiem wydanym wiadomość. – Warszawa, 1816. – S. 39, 57–72; *Daniłowicz I.* Rzut oka historyczny na prawodawstwo litewskie. – S. 240; *Бершадский С.А.* Литовский статут и польские конституции. Историко-юридическое исследование. – СПб., 1893. – С. 9–17; *Пташицкий С.Л.* К вопросу об изданиях и комментариях Литовского Статута. Историко-библиографическая справка. – СПб., 1893. – С. 17–22; *Ючас М.* Применение Статута 1588 г. в судебной практике XVII–XVIII веков // Первый Литовский Статут 1529 г. – Вильнюс, 1982. – С. 79.

[172] *Данилович И.* Взгляд на литовское законодательство. – С. 32; *Лаппо И.И.* Литовский Статут 1588 г. Т. 1. Исследование. Ч. 2. – Каунас, 1936. – С. 414–426.

сур'ёзную юрыдычную дапрацоўку, якая датычылася не нормаў Статута, а каментароў, што былі напісаны да большасці артыкулаў. Для параўнання ў заўвагах былі пазначаны спасылкі на заканадаўчыя акты Польшчы (Вісліцкі Статут, пастановы Уладзіслава Ягайлы 1423 г., Звычаі Кракаўскай зямлі 1505 г., і інш.). Да гэтага дадаваліся пастановы соймавых канстытуцый. Аднак спасылак на іншыя артыкулы самога Статута выданне не ўтрымлівала[175]. Адзначым, што змяшчэнне спасылак на польскае права не было новай ідэяй. У рукапісным Статуце 1566 г., які паходзіў з украінскіх зямель, утрымліваліся артыкулы з польскага заканадаўства[176].

Перавыданняў 1619 г. да нас дайшло не так шмат. Стан іх захавання розны. Кожнае з іх з'яўляецца цікавым. Асобнікі адрозніваюцца мастацкай аздобай. У іх змешчаны наступныя гравюры: партрэт Жыгімонта Вазы, Жыгімонт Ваза ў атачэнні Сената[177], сваяцкая сістэма[178].

Да разраду ўнікальных варта аднесці асобнік з Нацыянальнай бібліятэкі ў Варшаве[179]. Пры яго камплектаванні да кожнага ліста былі ўстаўлены чыстыя для нататак. Так укладаліся пазнейшыя выданні прававой літаратуры. Такую камплектацыю Статута маглі зрабіць толькі па спецыяльнай замове. На вялікі жаль, захаваліся не ўсе старонкі, адсутнічае пачатак. Усе старонкі запісаны каментарамі да кожнага артыкула. Пры напісанні выкарыстаны два колеры чарніл: для тытулаў – чырвоны, для тэксту – карычневы. У нататках змешчаны адсылкі да іншых падобных артыкулаў і соймавых канстытуцый. Каментары рабіў праўнік вельмі высокай кваліфікацыі, які добра ведаў усе артыкулы Статута, пастановы канстытуцый, польскае права. Але ў асобніку не захавалася інфармацыі, якая б паказвала на аўтарства нататак у Статуце.

Наступныя выданні 1648, 1693, 1744 гг.[180] у многім захавалі структуру выдання 1619 г., у тым ліку і каментары. Унутраныя спасылкі на іншыя артыкулы з'явіліся толькі ў выданні 1648 г.[181] Яны захаваліся ў наступных перавыданнях.

---

[173] Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. Wilna, 1614 (Biblioteka Narodowa XVII.4.1191).

[174] *Лаппо И.И.* Литовский Статут 1588 г. – Т. 1. Исследование. Ч. 2. – Каунас, 1936. – С. 427–431.

[175] Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego od Naiasnieyszego Hospodara Krola I.M. Zygmonta III na koronacyey w Krakowie roku 1588 wydany, a teraz po raz drugi podany w czym Statuta Korony Polskiey z Statutem WXL sa zgode w czym zas są różne: textu samego Statutu ni w czym nie odmieniaiąc przy artykułach tego Statutu na brzegach iest położono. – Wilna, 1619.

[176] Statut Wielkiego Księstwa Litewskiego, 1566 r. // Biblioteka Narodowa. Ack. 2049.

[177] У асобніку, які захоўваецца ў аддзеле Рэдкая кніга Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічная музея, змешчана толькі палова гравюры з соймам, іншыя гравюры адсутнічаюць. Таксама ў ім няма рукапісных каментароў і заўваг.

[178] Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1619 // Biblioteka Narodowa XVII.4.1719; XVII.4.2074; XVII.4.1782 (у гэтым экзэмпляры гравюра са сваяцкай сістэмай і загалоўныя літары размаляваны фарбамі).

[179] Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1619 // Biblioteka Narodowa XVII.4.3228.

[180] *Лаппо И.И.* Литовский Статут 1588 г. Т. 1. Исследование. Ч. 2. – Каунас, 1936. – С. 442–451, 457–461; *Eistreicher K.* Bibliografia polska. T. XXIX. – Kraków, 1933. – S. 233–239.

[181] Унутраныя спасылкі на артыкулы прыводзяцца па выданні 1648 г., але ў наступных перавыданнях яны такія ж самыя, таму не адзначаюцца.

Гэта рабіла працу праўнікаў больш зручнай. Кожнае перавыданне ўтрымлівала новыя пастановы соймавых канстытуцый.

Для вывучэння права ВКЛ важны не толькі змест артыкулаў, але і асобнікі Статутаў, якія з'яўляюцца дадатковай крыніцай вывучэння практыкі права. Перавыданні паказваюць, што развіццё заканадаўства не спынілася пасля прыняцця ў Статута 1588 г.

Амаль усе артыкулы Статута 1529 г. адносна шлюбу ўвайшлі ў *Статут 1566 г.*, але многія з іх былі дапрацаваны і пашыраны, а таксама з'явіліся новыя артыкулы[182]. З пашыранай рэдакцыі Статута 1529 г. перайшоў у другі Статут артыкул пра парадак выдачы дачок замуж[183], прычым быў дапрацаваны. У абавязак бацьку нявесты уводзілася ўзяць у зяця вяноўны запіс на 1/3 яго маёмасці. Ліст замацоўваўся пячаткай і подпісам апошняга і пячаткамі сведак, а пасля ўносіўся ў земскія кнігі па месцы знаходжання маёмасці, на якой запісана вена. Пры адсутнасці гэтага дакумента пасля смерці мужа жанчына губляла сваё ўнясенне, ёй выплачвалася толькі 30 коп літоўскіх грошаў, калі яна выходзіла другі раз замуж. Пры немагчымасці сваякоў выплаціць грошы шляхцянка заставалася жыць на ¼ маёмасці да канца свайго жыцця (Статут 1566 г. Р. 5. Арт. 1). У дадзеным артыкуле ўпершыню дакладна вызначалася якім чынам павінен быць афармлены дакумент. Пасля правядзення судовай рэформы актыкацыя многіх прыватна-прававых дакументаў (тэстаментаў, інвентароў маёнткаў, вяноўных запісаў і інш.) стала абавязковай у земскім судзе. А да гэтага часу яны занатоўваліся ў кнігі ваяводаў[184], земскіх судоў. Па пастанове Берасцейскага сойма 1566 г. дазвалялася дакументы актыкоўваць у кнігі гродскага суда, а пасля перанесці ў кнігі земскага па прычыне, што ехаць да гаспадара для зацвярджэння далёка, а земскі суд працаваў «рочкамі»[185].

Артыкул 1 захаваўся ў *Статуце 1588 г.* Але ў ім было ўведзена дакладнае акрэсленне пасагу: «*посагъ, то естъ гроши готовые, золото, серебро, перъла, каменье дорогое, совито шацуючы, а иншую выправу — шаты и всякие уберы, и хусты белые, кони, колыбки и вси инъшые речы рухомые*». Паводле яго азначала, што пасаг складаўся з грошай і рухомых рэчаў. Да таго ж вызначэннне паказвала тоеснаць тэрмінаў «пасаг» і «выправа». Хаця такое разуменне пасагу відавочна паказваюць прыватныя дакументы да прыняцця Статута 1588 г.[186], што сведчыць пра заканадаўчае замацаванне юрыдычнай практыкі.

---

[182] Далейшы аналіз артыкулаў Статута 1566 г. вядзецца ў параўнанні са Статутам 1588 г., бо ў многім яны паўтараюцца. Пра асаблівасці Статута 1588 г. адзначаецца асобна.

[183] У рукапісе Статута ВКЛ для Кіеўскага, Брацлаўскага і Валынскага ваяводстваў канца XVI ст. да гэтага артыкула прыведзены спасылкі на Гарадзельскі прывілей 1413 г., па якім дазвалялася запісваць сваім жонкам вена, і на Петрыкаўскі статут 1496 г., у якім адзначана пра абавязковую актыкацыю вяноўных запісаў, тэстаментаў у судовых кнігах ці каралеўскай канцылярыі. Статут ВКЛ 1566 г. // Biblioteka Czartoryskich. Rkps. 1423.

[184] Гл. напрыклад: НГАБ. – КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 34. – Арк. 3–4, 11адв.–12адв. і інш.

[185] Земскі суд працаваў у абмежаваны перыяд, які называўся «рочкі». Падаць скаргу ці актыкаваць дакумент можна было толькі ў гэты час. *Любавский М.К.* Литовско-Русский сейм. – С. 743–744.

[186] Напрыклад, такое разуменне пасагу ўтрымліваецца ў тэстаменце Яна Мікалаевіча Юндзіла (1578). Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст. (з актавых кніг Нацыя-

Для судовай практыкі артыкул меў важнае значэнне. Аб гэтым сведчаць адзнакі ў некаторых асобніках. У польскамоўным выданні Статута 1614 г. падкрэслены ўрывак аб тым, хто павінен выдаваць замуж дзяўчыну ў выпадку смерці бацькі, а таксама аб выдзяленні маёмасці для невенаванай удавы[187]. Пачынаючы з перавыдання 1619 г., змяшчаецца друкаваны каментар аб аправе вялікай княгіні літоўскай і польскай каралевы на землях ВКЛ. У рукапісным каментары[188] падаецца спасылка на соймавыя пастановы 1581, 1593, 1609, 1611 гг.[189] Коратка паўтараецца змест артыкула і да кожнага яго палажэння прыведзены спасылкі на іншыя артыкулы[190]. Было адзначана, што дзяўчына, якая не атрымала вяноўнага запісу пры заключэнні шлюбу, траціла вена пасля смерці мужа[191]. У выданні 1648 г. змешчаны спасылкі толькі на неабходныя тры артыкулы[192].

Захавалася норма пра аднолькавы памер пасагу для ўсіх дачок, таксама як і прызначэнне яго на ¼ маёмасці бацькі. Дадавалася пра растрату пасагу братамі, якая трактавалася як пазыка (Статут 1566 г. Р. 5. Арт. 3). Гэты артыкул быў змешчаны ў Статуце 1588 г. з невялікімі зменамі. Чацвёртую частку маёмасці павінен быў вызначаць падкаморы ў прысутнасці двух шляхцічаў. За растрату пасагу адказвалі не толькі браты, але маці і дзядзькі, калі мелі да гэтага дачыненне (Статут 1588 г. Р. 5. Арт. 3)[193].

У пастановы сойма 1588 г., яшчэ да прыняцца Статута, увайшлі пункты пра пасаг, але ў іх пра выдзяленне пасагу з ¼ маёмасці не згадвалася. Паводле іх, калі бацька памёр і не вылучыў пасагу дочкам, то пасля яго смерці, не пазней чым праз год, браты павінны выдаць пасаг па сваім сумленні ў прысутнасці двух сваякоў з бацькоўскай і з мацярынскай ліній. Як абавязковая ўмова – дазвол на шлюб ад сваякоў. Братам уводзілася ў абавязак выхоўваць сясцёр да іх шлюбу.

нальнага гістарычнага архіва Беларусі) / А.Ф. Аляксандрава, В.У. Бабкова, І.М. Бобер; Нац. гіст. архіў Беларусі. – Мінск, 2012. – С. 324.

187 Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1614 // Biblioteka Narodowa XVII.4.1191. – S. 196.

188 Тут і далей будзем ужываць тэрмін «рукапісны каментар» для асобніка Статута з нататкамі, каб адрозніць ад каментароў друкаваных, якія змяшчаліся ў кожным асобніку.

189 Volumina legum. T. II. Przedruk zbioru praw, staraniem xx. pijarów w Warszawie, od roku 1732 do roku 1782 wydanego. Prawa, konstytucye y przywileje królestwa Polskiego, Wielkiego Xięstwa Litewskiego y wszystkich prowincyi należących na walnych seymiech koronnych od seymu wiślickiego roku pańskiego 1347 aż do ostatniego seymu uchwalone. – Petersburg, 1859. – S. 211, 344, 437, 465.

190 Змешчаны спасылкі на артыкулы: Р. 5. Арт. 2, 5, 6,10, 11, 17; Р 7. Арт. 1, 2, 6, 7, 24; Р. 9. Арт. 26. Такая колькасць нормаў абумоўлена тым, што згадваліся як артыкулы, якія мелі не толькі непасрэднае дачыненне, так і ўскоснае, напрыклад, адносна судоў. Гэта было неабходна для праўніка, якому важна было ведаць не толькі парадак складання дакумента, але і парадак яго актыкацыі. Праўнік каментаваў падобным чынам усе артыкулы. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1619 // Biblioteka Narodowa XVII.4.3228. – S. 196.

191 Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1619 // Biblioteka Narodowa XVII.4.3228. – S. (180–180v), 197. Дадзенае выданне мае падвоеную нумарацыю: адна – тагачасная друкарская, а другая – сучасная алоўкам. Другая нумарацыя выкарыстоўваецца для пазначэння старонак з каментарамі ад рукі. Каб не блытаць з друкарскай, яна ўзята ў круглыя дужкі.

192 Спасылкі на артыкулы: Р. 7. Арт. 24, Р. 5. Арт. 6 і 10. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1648. – S. 188.

193 *Czacki T.* O litewskich i polskich prawach. – S. 11.

Асобна было разгледжана выпасажэнне з застаўных маёнткаў. Пастанова абараняла маёмасныя правы жанчын. Калі жанчына выйшла замуж, але пасаг не атрымала па прычыне трымання маёмасці ў заставе, то ўсё роўна яе частку выдзяляў крэдытор ці ўладальнік на падставе звычаю і права. Пасаг неабходна было перадаць на працягу года пасля шлюбу. Жанчына, якая мела вена на застаўным маёнтку, карысталася правам трымаць яго, ці забраць вяноўную суму. А калі ўдава памірал, то спадкаемцы забіралі вена ў крэдытораў[194]. Статут 1588 г. не ўтрымліваў апісання парадку выдзялення пасагу дачцэ пасля смерці бацькі, таксама як вылучэння вена і пасагу з застаўных уладанняў. Гэтая пастанова згадвалася ва ўсіх перавыданнях Статута 1588 г., яна змешчана ў рукапісным каментары. Акрамя таго, спасылкі даюцца на іншыя нормы Статута[195]. У выданні 1648 г. на палях пазначана спасылка толькі на адзін артыкул (Р. 3. Арт. 17)[196].

Новыя артыкулы аб пасагу былі ўведзены Статутам 1588 г. Калі дочкі пры жыцці бацькі атрымалі пасаг, то пасля яго смерці не мелі права прэтэндаваць на іншую маёмасць сям'і. Таксама ўсталёўваўся тэрмін даўніны на атрыманне пасагу – 10 год. Пасля сканчэння гэтага перыяду шляхцянка не магла ініцыяваць судовы працэс супраць сваякоў (Статут 1588 г. Р. 5. Арт. 4)[197]. У рукапісных каментарах да артыкула дадаваліся спасылкі на пастанову соймавай канстытуцыі 1588 г. і на нормы Статута[198], у выданні 1648 г. – на адзін артыкул (Р. 6. Арт. 5)[199]. Сойм 1611 г. усталяваў наступныя тэрміны даўніны па справах атрымання пасагу: для вяртання неатрыманага пасагу для замужняй жанчыны – 10 год, недададзеных рэчаў з пасагу – тры гады і тры месяцы[200].

У выпадку смерці бяздзетнай жонкі пасаг вяртаўся ў яе родную сям'ю. Звычай быў кадыфікаваны толькі ў Статуце 1566 г. У першую чаргу пасаг прызначаўся незамужняй сястры (Статут 1566 г. Р. 5. Арт. 17). У Статуце 1588 г. парадак спадкаемства пасагу патлумачаны больш падрабязна: ён ішоў бацькам, а калі іх не было, то братам, а калі была сястра – то сястры (Статут 1588 г. Р. 5. Арт. 19). Увядзенне дадзенага артыкула патрабавалі выпадкі з судовай практыкі. У рукапісных каментарах дадаткова спасылаюцца на нормы: Р. 5. Арт. 2, 3; Р. 7. Арт. 16[201], а ў выданні 1648 г. – Р. 5. Арт. 2, 3[202].

---

[194] Volumina legum. T. II. – S. 254, 257.

[195] У рукапісных каментарах змешчаны спасылкі на: Р. 1. Арт. 33; Р. 3. Арт. 2, 10, 11, 44, 45; Р. 4. Арт. 10, 91; Р. 5. Арт. 4, 19; Р. 6. Арт. 5, 6, 9, 13; Р. 7. Арт. 11, 13, Р. 9. Арт. 19. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. Wilna, 1619 // Biblioteka Narodowa XVII.4.3228. – S. (184).

[196] Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1648. – S. 190.

[197] *Czacki T.* O litewskich i polskich prawach. – S. 56.

[198] У рукапісных каментарах змешчаны спасылкі на: Р. 1. Арт. 33; Р. 3. Арт. 2, 10, 11, 44, 45, 70; Р. 4 Арт. 91; Р. 5. Арт. 3; Р. 6. Арт. 5, 6, 9; Р. 7. Арт. 11, 13. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1619 // Biblioteka Narodowa XVII.4.3228. – S. (184).

[199] Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1648. – S. 191.

[200] Volumina legum. – T. III. – S. 43.

[201] Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1619 // Biblioteka Narodowa XVII.4.3228. – S. (192).

[202] Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1648. – S. 198.

Як і ў Статуце 1529 г., дзяўчына пазбаўлялася пасагу і спадчыны, калі выходзіла замуж супраць волі бацькоў, сваякоў ці апекуноў. Але калі браты ці сваякі наўмысна не дазвалялі выйсці замуж дзяўчыне, то яна мела права звярнуцца да ўладаў[203] (Статут 1566 г. Р. 5. Арт. 7, 8; Статут 1588 г. Р. 5. Арт. 8, 9)[204]. Невядомы праўнік на палях у выданні 1614 г. адзначаў пра гэты артыкул, што ён патрэбны[205]. У рукапісным каментары даюцца спасылкі на 8 і 9 артыкулы[206], таксама і ў выданні 1648 г.[207].

Па-ранейшаму за шляхцянкай захоўвалася права выйсці замуж па сваёй волі, без прымусу (Статут 1566 г. Р. 3. Арт. 31; Статут 1588 г. Р. 3. Арт. 39)[208]. Пазнейшыя перавыданні даюць спасылкі на наступныя нормы: Р. 3. Арт. 2; Р. 11. Арт. 13; Р. 5. Арт. 8[209].

Палітыка сацыяльнай эндагаміі паўплыва на ўвядзенне наступных нормаў. Дзяўчына ці ўдава пазбаўлялася спадчыны, калі яна брала шлюб з мужчынам іншага сацыяльнага стану: мешчанінам ці селянінам. Ёй прызначалася толькі грашовая кампенсацыя, але ў два разы меншая за кошт пасагу (Статут 1566 г. Р. 5. Арт. 11)[210]. Дадзены артыкул быў пасля ўключаны ў Статут 1588 г. (Р. 5. Арт. 12). Ён не дазваляў пераходзіць нерухомай шляхецкай маёмасці да прадстаўнікоў іншых саслоўяў, а таксама абмяжоўваў пранікненне мяшчан і сялян у шляхецкае саслоўе праз шлюб. Такая дыскрымінацыя дзейнічала толькі адносна жанчын[211]. Калі шляхціч жаніўся з мяшчанкай ці сялянкай, то яна і яе дзеці набывалі шляхецтва. Але такая жанчына губляла прыналежнасць да шляхецтва ў выпадку новага шлюбу з прадстаўніком іншага саслоўя (Статут 1566 г. Р. 3. Арт. 16)[212]. Гэты артыкул быў перанесены і ў наступны звод законаў (Статут 1588 г. Р. 3. Арт. 20)[213], але ў Статуце 1529 г. яго не было[214]. Гэты падыход да міжсаслоўных шлюбаў быў у візантыйскім праве, калі мужчына мог ажаніцца з

---

[203] Спасылаючыся на 8 артыкул раздзела 5 Статута 1566 г., Ганна Збаражская падала ў Луцкі гродскі суд скаргу на братоў Станіслава, Льва і Матыса за перашкоду выйсці замуж. Дазвол яна атрымала ад суда (1584). Архив ЮЗР. – Ч. 8. Т. 3. – К., 1909. – С. 415–416.

[204] *Малиновский И.* Учение о преступлении по Литовскому Статуту. – К., 1894. – С. 59; *Лаппо И.И.* Великое княжество Литовское. – С. 520; *Dąbkowski P.* Dobra rodowe i nabyte. – S. 26.

[205] Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1614. – S. 200. (Biblioteka Narodowa XVII.4.1191).

[206] Да артыкула 8 падаваліся спасылкі на наступныя артыкулы: Р. 5. Арт. 3, 9, 11, 12, 19; Р. 6. Арт. 1, 4; Р. 11. Арт. 13 і на канстытуцыі 1588 г. аб пасагу, 1607 г. аб гвалтоўным узяцці ў шлюб (Volumina legum. T. II. – S. 444), 1573 і 1576 г. аб забароне браць шлюб каралям без дазволу рады, а да артыкула 9 – Р. 3. Арт. 39; Р. 5. Арт. 8, 11, 12; Р. 11. Арт. 13. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1619 // Biblioteka Narodowa XVII.4.3228. – S. (186).

[207] На палях да артыкула 8 адзначана спасылка на Р. 11. Арт. 13, а да артыкула 9 на – Р. 3. Арт. 6, 39; Р. 5. Арт. 12. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1648. – S. 193.

[208] *Лаппо И.И.* Великое княжество Литовское. – С. 519.

[209] Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1648. – S. 193, 281.

[210] *Спасович В.Д.* Об отношениях супругов. – С. 154–155; *Пичета В.И.* Земельное право. – С. 478; *Таўталес А.* Права сямейнае. – С. 991, 1001; *Andriulis V.* Lietuvos Statutų. – P. 59.

[211] Да артыкула дадаюцца спасылкі на нормы: Р. 3. Арт. 21, 26; Р. 4. Арт. 98; Р. 5. Арт. 8, 10, 15; Р. 11. Арт. 13. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1619 // Biblioteka Narodowa XVII.4.3228. – S. (188). У пазнейшых перавыданнях заўваг да гэтага артыкула не было.

[212] *Andriulis V.* Lietuvos Statutų. – P. 62.

[213] У пазнейшых выданнях ідзе спасылка на Р. 3. Арт. 25.

[214] *Czacki T.* O litewskich i polskich prawach. – S. 300.

рабыняй без страт у статусе і маёмасці, а жанчына – не. На нашых землях ён вядомы праз кормчыя[215]. Такі розны падыход да шлюбу мужчыны і жанчыны з асобамі ніжэйшага статусу быў звязаны з парадкам спадкаемства. У ВКЛ панавала патрылінейная традыцыя, спадчына перадавалася па мужчынскай лініі.

Статут 1566 г. не ўтрымліваў забароны на міжэтнічныя, а таксама міжрэлігійныя і міжканфесійныя шлюбы[216]. Пры гэтым па канстытуцыі сойма 1568 г. татарам забараняліся браць шлюбы з хрысціянкамі[217]. Пастанова не ўвайшла ў Статут 1588 г., але была паўторана ў пастанове 1616 г.[218].

Вена складалася з сумы за пасаг і такой жа сумы прывенку, г.зн. мужчына на сваёй маёмасці запісваў падвоеную суму пасагу. Але жанчына мела права распараджацца толькі грошамі за пасаг, а не за прывенак. Мужу дазвалялася дарыць жонцы рухомыя рэчы (золата, серабро, каштоўнасці і інш.), за выключэннем зброі, жывёлы і нявольнай чэлядзі. Няслушныя запісы не мелі юрыдычнай моцы. Калі 1/3 маёмасці зяця была меншай за пасаг, то бацька купляў дачцэ маёнтак, якім яна пасля распараджалася (Статут 1566 г. Р. 5. Арт. 2)[219].

Гэты артыкул быў уключаны ў Статут 1588 г. з дапаўненнем: у выпадку смерці жонкі без тэстаменту гэты маёнтак вяртаўся да сям’і, з якой яна паходзіла. Жанчына мела права на вена толькі ў першым шлюбе. Калі яна выходзіла замуж другі ці трэці раз, то наступныя сужэнцы не былі абавязаны запісваць вена (Статут 1588 г. Р. 5. Арт. 2)[220]. У асобніку 1588 г. выдання побач з гэтым артыкулам быў зроблены допіс, што ён патрэбны тым, хто збіраецца ажаніцца[221]. У выданні 1619 г. у рукапісным каментары былі змешчаны асобныя пункты з артыкула і спасылкі на іншыя артыкулы Статута[222].

Муж не мог застаўляць ці дарыць маёнткі, на якіх было запісана вена. Усе маёмасныя аперацыі з імі павінны былі праводзіцца са згоды жонкі (Статут 1566 г. Р. 5. Арт. 16). Тое ж захавалася ў трэцім Статуце, толькі дадаўся артыкул, што калі з такога маёнтка былі нанесены шкоды, то ў судзе адказваў муж (Статут 1588 г. Р. 5. Арт. 17)[223]. Выданне Статута 1619 г. дадаткова адсылала да Р. 4. Арт. 49; Р. 5. Арт. 1, Р. 7; Арт. 1, 6[224], а 1648 г. толькі да Р. 5. Арт. 1[225].

---

[215] Nomokanon recensionis serbicae sive collectio canonum ss. Apostolorum et conciliorum. 1599 // Biblioteka Narodowa. Rps. Akc. 10782. K. 402 v. – 406; «Книги законные» содержащия в себе, в древне-русском переводе, византийские законы земледельческие, уголовные, брачные и судебные / Издал А. Павлов. – СПб., 1885. – С. 68–69, 84.

[216] *Andriulis V.* Lietuvos Statutų. – P. 56.

[217] Документы Московского архива Министерства Юстиции. Т. 1. – Москва, 1897. – С. 481.

[218] Volumina legum. – T. III. – S. 150–151; *Andriulis V.* Lietuvos Statutų. – P. 58.

[219] *Лаппо И.И.* Великое княжество Литовское. – С. 478.

[220] *Спасович В.Д.* Об отношениях супругов. – С. 155–157.

[221] «Potrzebny artykuł dla przeczytania, który chce żenić». Статут Великого Княжества Литовского. – Вильно, 1588 // Biblioteka Narodowa. BN XVI. F. 612. K. 121. Запісы датуюцца прыкладна 30-мі гг. XVII ст. Паводле іншых нататак можна сцвярджаць, што дадзены асобнік выкарыстоўваўся ў Менскім ваяводстве і вёўся прадстаўнікамі роду Хмараў.

[222] У каментары спасылаліся на артыкулы: Р. 3. Арт. 41, 43; Р. 5. Арт. 6, 19; Р. 7. Арт. 1, 2, 16. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1648. – S. 203.

[223] *Czacki T.* O litewskich i polskich prawach. – S. 54.

[224] Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1619 // Biblioteka Narodowa XVII.4.3228. – S. (192).

[225] Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1648. – S. 197.

У другім Статуце захаваўся артыкул аб наступленні паўналецця: для хлопчыкаў з 18 год, а дзяўчынак – з 15 (Статут 1566 г. Р. 3. Арт. 38). У Статуце 1588 г. шлюбны ўзрост для дзяўчат наступаў з 13, а для хлопчыкаў застаўся той жа – 18 год (Статут 1588. Р. 6. Арт. 1.)[226].

Асобна ў Статуце 1588 г. звярталася ўвага на шлюб немаёмасных асобаў. Новы артыкул быў запазычаны з нямецкага права і адрозніваўся ад іншых нормаў[227]. Ён рэгуляваў маёмасныя дачыненні. Разглядаўся выпадак адсутнасці на момант шлюбу пасагу ў дзяўчыны і маёмасці мужчыны, калі пасля яны разам нажылі маёмасць і памерлі не напісаўшы тэстамент. Калі муж паміраў першы, то жанчына атрымлівала 1/3, а астатнія часткі – дзеці, а ў бяздзетнай пары ўсё пераходзіла жанчыне. А калі яна памірала, не пакінуўшы распараджэння аб маёмасці, то ўласнасць дзялілася паміж яе сваякамі і сваякамі мужа. Такім жа чынам размяркоўвалася маёмасць, калі шляхцянка памірала першай (Статут 1588 г. Р. 5. Арт. 21). Гэты артыкул быў актуальны для збяднелай шляхты, якая магла выслужыць маёнтак. Адсутнасць пасагу ўсе роўна гарантавала ўдовін столец для жанчыны. Нашчадкамі першай чаргі заставаліся дзеці. Але адметна, што такі маёнтак не адыходзіў толькі да сваякоў мужа, сваякі жанчыны мелі права на сваю частку[228].

Статуты 1566 і 1588 гг. захавалі без зменаў норму Статута 1529 г. аб згвалтаванні дзяўчыны (Статут 1566 г. Р. 11. Арт. 8; Статут 1588 г. Р. 11. Арт. 12)[229]. Пакаранне за злачынства засталося ў кампетэнцыі ваяводаў і старостаў (Статут 1588 г. Р. 4. Арт. 30).

Да адзначанага артыкула дадаваўся артыкул аб гвалтоўным шлюбаванні з жанчынай. За гэтае злачынства мужчыну каралі смерцю, а 1/3 яго маёмасці пераходзіла пакрыўджанаму боку, а з 2/3 – выплачваліся страты. Калі дзяўчына ўдзельнічала ў змове, то яна пазбаўлялася спадчыны і пасагу (Статут 1566 г. Р. 11. Арт. 9)[230]. У Статуце 1588 г. гэты артыкул быў пашыраны. Мужчына не караўся смерцю, калі дзяўчына давала згоду на шлюб. Аднак пры ўзяцці дзяўчынай рэчаў з дому, сваякі мелі права вяртаць маёмасць праз суд (Статут 1588 г. Р. 11. Арт. 13)[231]. Гэтая норма была ўведзена з-за даўняй традыцыі выкрадання нявесты, аб якой узгадваецца яшчэ ў «Аповесці мінулых гадоў». Шлюб праз

---

[226] *Лаппо И.И.* Литовский Статут 1588 г. – Т. 1. Исследование. Ч. 2. – Каунас, 1936. – С. 39; *Таўталес А.* Права сямейнае. – С. 990. У выданні 1648 г. змешчана спасылка на Р. 5. Арт. 9. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1648. – S. 203.

[227] *Czacki T.* O litewskich i polskich prawach. – S. 55; *Спасович В.Д.* Об отношениях супругов. – С. 149.

[228] У рукапісных спасылках выдання 1619 г. дадаткова адсылалі да артыкулаў: Р. 3. Арт. 28; Р. 4. Арт. 10; Р. 5. Арт. 1, 6, 11, 16, 20, 21, Р. 7; Арт. 1, 6. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1619 // Biblioteka Narodowa XVII.4.3228. – S. 210, (194). Выданне 1648 г. – толькі да артыкула Р. 5. Арт. 1. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1648. – S. 200.

[229] У выданні 1648 г. падаюцца спасылкі на Р. 14. Арт. 29 і Р. 11. Арт. 13. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1648. – S. 280.

[230] *Лаппо И.И.* Великое княжество Литовское. – С. 521.

[231] *Малиновский И.* Учение о преступлении. – С. 59.

гвалт адбываўся без згоды бацькоў, што супярэчыла кананічнаму праву[232]. Водгаласы такога шлюбу захаваліся ў беларускіх народных абрадах яшчэ ў XIX ст.[233] А часам нават здараліся выпадкі вывазу дзяўчат[234]. Звычай крадзяжу нявесты таксама меў месца ў еўрапейскіх краінах[235].

Паводле класіфікацыі крымінальных спраў па соймавай пастанове 1611 г., шлюб праз гвалт быў аднесены да віду прыватнай крымінальнай справы. У сувязі з гэтым загадвалася разглядаць гэтыя справы як іншыя крымінальныя, злачынца саджаць у вязніцу, нават калі жанчына сведчыла на яго карысць[236].

Шлюб праз гвалт заставаўся актуальнай праблемай, што прымушала прымаць адпаведныя меры. У соймавую канстытуцыю 1607 г. быў унесены пункт аб гвалтоўным вывазе непаўналетніх асобаў жаночага полу ад бацькоў ці апекуноў. Такія злачынцы падлягалі зняволенню. Справы адносіліся да кампетэнцыі мясцовых судоў[237]. На сойме 1631 г. было адзначана аб пашырэнні ў практыцы шлюбаў праз гвалт. Была прынятая пастанова пра павелічэнне грашовага спагнання за вываз жанчыны, з дадаткам, што ад пакарання рабаўнік не можа быць вызвалены, нават калі жанчына пад прысягай сведчыла, што была згодна выехаць, але яе сваякі гэтага не пацвярджалі. Такія справы разглядаліся ў Трыбунале[238]. Нунцый Ганарацы Вісконці ў лісце да кардынала дэ Торэса ад 22 сакавіка 1631 г. згадаў гэтую пастанову і адзначыў, што яна павінна зменшыць колькасць падобных выпадкаў[239].

Да артыкулаў пра звалтаванне жанчыны і гвалтоўным узяцці ў шлюб блізка норма пра намаўленне замужняй жанчыны з'ехаць з дому. Гэтае злачынства аддавалася пад юрысдыкцыю гродскага суда. За яго прызначалася смяротнае пакаранне абаім. Жанчыну мог вызваліць толькі яе муж. За нанесеныя матэрыяльныя шкоды спагнанне бралі з маёмасці злачынцы. Калі ж ён падчас пагоні забіў мужа жанчыны, то адносна яго дзейнічаў артыкул 30 гэтага ж раздзела, як тычыўся пралюбадзеяў (Статут 1588 г. Р. 14. Арт. 29)[240]. У выданні 1648 г. артыкулы 30 (Р. 14) і 13 (Р. 11) звязаны паміж сабой спасылкамі, а таксама згадваюцца пастановы канстытуцый 1607 і 1631 гг.[241].

---

[232] *Макушев В.В.* Сказания иностранцев о быте и нравах славян. – СПб., 1861. – С. 138–139; *Ланге О.* О правах собственности супругов. – С. 24; *Неволин К.А.* Полное собрание сочинений. – Т. 3. – С. 128–129; *Abraham W.* Zawarcie małżeństwa w pierwotnem prawie polskim. T. IX. – Lwów, 1925. – S. 67–75; *Krawiec A.* Seksualność ... – S. 63.

[233] *Баргдановіч А.* Пережитки древнего миросозерцания белорусов. Этнографический очерк. – Гродна, 1895. / Рэпрынт. – Мінск, 1995. – С. 121.

[234] *Никольский Н.М.* Происхождение и история белорусской свадебной обрядности. – С. 52–54.

[235] *Brudage J.A.* Law, Sex, and Christian Society. – P. 128; *McNamara Jo Ann, S. Wemple.* The Power of Women through the Family in Medieval Europe 500–1100 // Women and Power in the Middle Ages. – Athens and London, 1998. – P. 85.

[236] Volumina legum. – T. III. – S. 36, 326.

[237] Volumina legum. – T. II. – S. 444.

[238] Volumina legum. – T. III. – S. 326.

[239] [*Rekaczewski E.*] Relacye nuncyuszów. – T. 2. – S. 180–183.

[240] *Малиновский И.* Учение о преступлении. – С. 60; *Kunsmanaitė J.* Provisions for Widowhood. – P. 88.

[241] Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1648. – S. 280, 281, 359.

Частка артыкулаў была прысвечана разгляду становішча ўдавы (Статут 1566 г. Р. 5. Арт. 1, 4, 5, 9–12, 14, 15; Статут 1588 г. Р. 5. Арт. 1, 5, 6, 11–13, 16–18). Асобныя з іх былі ўзяты з папярэдняга Статута 1529 г.: аб трыманні маёмасці ўдавой з паўналетнімі і непаўналетнімі дзецьмі, аб бясплоднай удаве, аб дзецях ад некалькіх жонак. Змены ў іх былі ўнесены неістотныя[242]. Калі паводле першага Статута дзеці і сваякі не абавязаны былі выплачваць вянец невенаванай удаве, то ў наступных Статутах адзначалася, што яны павінны выдаць ёй 30 коп літоўскіх грошаў[243].

Удава мела права пайсці замуж толькі праз шэсць месяцаў і тыдзень пасля смерці мужа[244]. Да прыняцца гэтай нормы ў Статуце 1566 г. былі выпадкі, калі ўдава хутка выходзіла замуж другі раз[245]. Тэрмін вызначаны для захавання прыстойнасці ў жалобе[246]. Таксама гэты час быў неабходны, калі жанчына была цяжарная. Для спадкаемства было важна дакладнае разуменне, у якім шлюбе нарадзіліся дзеці[247]. Пры хуткім другі шлюбе існавала вялікая верагоднасць у блытаніне з бацькоўствам дзіцяці. Адпаведна ўзнікала праблема спадкаемства. Калі жанчына выходзіла замуж раней, то губляла вена, а калі вена не было ёй запісана, то плаціла грашовае спагнанне (Статут 1566 г. Р. 5. Арт. 12). У Статуце 1588 г. гэты артыкул захаваўся без зменаў (Статут 1588 г. Р. 5. Арт. 13)[248]. Адносна ўдаўцоў тэрміну захавання жалобы не прадугледжвалася.

У выпадку запісу ўдаве вена ад першага мужа другі муж вена ўжо не вылучаў на сваёй маёмасці. Пасля яго смерці яна атрымлівала роўную з усімі дзецьмі частку маёмасці, на якой мела права пажыццёва застацца (Статут 1566 г. Р. 5. Арт. 15)[249]. Артыкул быў перанесены ў Статут 1588 г. з дапаўненнем, што ўдаве ў карыстанне аддавалася 1/3, калі ў яе з другім мужам было адно дзіцё, а пасля яе смерці гэтая частка пераходзіла да сваякоў. Аднак муж меў права запісаць жонцы нерухомыя і рухомыя рэчы. У такім выпадку яна не мела права ад дзяцей і сваякоў патрабаваць 1/3 частку маёмасці мужа (Статут 1588 г. Р. 5. Арт. 16).

---

[242] *Дзербіна Г.* Права і сям’я эпохі Рэнесансу. – С. 141; *Czacki T.* O litewskich i polskich prawach. – S. 9–11; *Kunsmanaitė J.* Provisions for Widowhood. – P. 95, 100–102.

[243] *Спасович В.Д.* Об отношениях супругов. – С. 159; *Valikonytė I.* The Venets of Noblewomen in the Grand Duchy of Lithuania. – P. 99.

[244] *Малиновский И.* Учение о преступлении. – С. 60; *Andriulis V.* Lietuvos Statutų. – P. 55.

[245] Іван Копаць памёр у пачатку лютага 1563 г., а ў маі гэтага ж года Марына Львоўна Палубенская была ўжо замужам за Станіславам Нарушэвічам. АВАК. Т. 17. Акты Гродненского земского суда. – Вильна, 1890. – С. 433–437; *Wolff J.* Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku. – Warszawa, 1895. – S. 373.

[246] Выпадак скаргі на жанчыну за другі шлюб, які адбыўся раней тэрміну, зафіксаваны ва Уладзімірскім гродскім судзе. Багдан, Аўрам і Іван Богушавічы Пузоўскія паскардзіліся на братавую Марыну Іванаўну. Пасля забойства іх брата Сямёна прайшло толькі 17 тыдняў, як яна стала жонкай Яна Каспераскага. Акрамя таго, Марына не скончыла справу з забойцамі мужа, схавала дзяцей, забрала рухомыя рэчы (1580). Архив ЮЗР. – Ч. 8. Т. 3. – К., 1909. – С. 309–315.

[247] *Спасович В.Д.* Об отношениях супругов. – С. 158; *Лаппо И.И.* Великое княжество Литовское. – С. 520.

[248] У рукапісным каментары змешчаны спасылкі на Р. 5. Арт. 10 і 12. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1619 // Biblioteka Narodowa XVII.4.3228. – S. (190).

[249] Адносна гэтага артыкула Т. Чацкі адзначыў, што ён з’явіўся толькі ў Статуце 1588 г., таксама памыліўся з нумарам артыкула 13 замест 18. *Czacki T.* O litewskich i polskich prawach. – S. 54.

Сойм 1611 г. усталяваў тэрмін даўніны – шэсць год – для ўдоў на атрыманне сваёй спадчыны і пасагу[250].

Статут 1566 г. пашырыў паняцце «бенкарт». Да гэтай катэгорыі сталі адносіцца не толькі дзеці, народжаныя ў нявенчаным шлюбе, але і дзеці ад каханкі. Прычым яны не маглі стаць законнанароджанымі, нават калі пасля смерці жонкі шляхціч ажаніўся з каханкай, таксама як і дзеці, якія нарадзіліся ў такім шлюбе пазней. Тлумачылася працэдура адрачэння бацькі ад сына: свядома, а не ў раз'юшаным стане і ў выніку сваркі. Сыны, прызнаныя пры жыцці іх маці, заставаліся ў сваім статусе і пасля яе смерці (Статут 1566 г. Р. 3. Арт. 23)[251]. У параўнанні з папярэднім зводам законаў, тут больш увагі было звернута на сам тэрмін «бенкарт», больш падрабязна патлумачаны выпадкі адмаўлення ад сыноў. Але, як і раней, асноўнымі дзеючымі асобамі тут выступалі бацька і сыны. У Статуце 1588 г. адзначана, што вырачэнне мела дачыненне і да дачок. Незаконнымі прызнаваліся яшчэ дзеці ад шлюбу паміж сваякамі, калі яны пры жаніцьбе ведалі аб сваяцтве (Статут 1588 г. Р. 3. Арт. 28; Р. 5. Арт. 22)[252].

У канстытуцыі 1578 г. была прынята дадатковая пастанова адносна шляхцічаў, якія, замест законных жонак, жылі з наложніцамі, мелі ад іх дзяцей, а пасля жаніліся з імі. Дзеці ад такіх стасункаў лічыліся незаконнымі[253]. Гэтая норма згадвалася ў каментару перавыдання Статута 1619 г. і ўтрымлівалася ў пазнейшых перавыданнях. Яна згадваецца ў рукапісным каментары да выдання 1619 г.[254].

За забойства бенкарта вызвалялі ад смяротнага пакарання. Калі на момант злачынства яшчэ жыла маці, то ёй выплачвалася галаўшчызна як за простага чалавека (Статут 1588. Р. 14. Арт. 32). Артыкулы аб бенкартах былі дапрацаваны, было пашырана кола асобаў, якія траплялі да катэгорыі незаконнанароджаных, пацверджана іх абмежаванне ў статусе і маёмасці. Наяўнасць бенкарта ў шляхецкай сям'і ставіла яе на ніжэйшую сацыяльную прыступку і пазбаўляла магчымасці перадаваць па спадчыне маёмасць. У выніку шляхецкая сям'я не выконвала адносна дзяцей сацыялізацыйную, статусную, абарончую і эканамічную функцыі, што падрывала асновы існавання дадзенага інстытута. Увядзенне гэтых артыкулаў спрыяла знікненню нявенчанага шлюбу ў шляхецкім асяроддзі[255]. Але пры гэтым за такі шлюб адмысловага пакарання не было[256]. У статусе цярпелі пазашлюбныя дзеці. Заканадаўчыя акты і канстытуцыя 1578 г. таксама негатыўна ставіліся да канкубіната, але ніякіх пакаранняў супраць парушальнікаў не прызначалі.

---

[250] Volumina legum. – T. III. – S. 43.

[251] *Лаппо И.И.* Великое княжество Литовское. – С. 249–250.

[252] Падобную норму мела Салічная Праўда: Салическая правда. – Москва, 1950. – С. 22.

[253] Volumina Legum. – T. II. – S. 187.

[254] У рукапісным каментары яшчэ ўтрымліваецца спасылка на Р. 8. Арт. 2. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1619 // Biblioteka Narodowa XVII.4.3228. – S. (53).

[255] *Bardach J.* Świecki charakter zwyczajowego prawa małżeńskiego. – S. 85–148; *Левицький О.* Сім'я і побут українців у XVI ст. – С. 213.

[256] *Левицький О.* Сім'я і побут українців у XVI ст. – С. 211.

У Статуце 1566 г. упершыню з’явіўся артыкул аб разводзе. У ім адзначалася, што калі муж вінаваты ў разводзе, то жонцы пакідалася вена, а калі яна была вінаватая, то страчвала ўнясенне (Статут 1566 г. Р. 5. Арт. 18). Скасаванне шлюбу разглядалася ў духоўным судзе, але маёмасныя справы паміж сужэнцамі вырашаў свецкі суд. Было адзначана, што калі муж і жонка былі сваякамі, але не ведалі аб гэтым, то кожны заставаўся пры сваёй маёмасці. Блізкае сваяцтва лічылася перашкодай для шлюбу. Гэты артыкул з невялікім дапаўненнем быў уключаны ў Статут 1588 г.[257] (Статут 1588 г. Р. 5. Арт. 20)[258].

Асобным артыкулам забараняўся шлюб паміж сваякамі да чацвёртай ступені сваяцтва па бацькоўскай і мацярынскай лініі (Статут 1588 г. Р. 5. Арт. 22)[259]. Пералічваліся сваякі, паміж якімі не магло быць шлюбных дачыненняў. Разглядаўся выпадак, калі першы шлюб адпавядаў закону, а другі быў нязаконны са сваяком ці сваячкай. Такія справы знаходзіліся ў юрысдыкцыі земскага суда. Парушальнікі пазбаўляліся паловы сваёй маёмасці на карысць дзяржавы. Жанчына траціла пасаг, а калі мела нерухомую маёмасць, то палову яе. На другой палове дазвалялася толькі пажыццёвае пражыванне. Мужчыну не дазвалялася займаць пасады. Не падлягалі пакаранню асобы, якія не ведалі пра сваяцтва і дакавзалі гэта пад прысягай. Шлюб паміж сваякамі скасоўвалі. А магчымасць наступнага шлюбу разглядалася ў духоўным судзе[260].

У заканадаўстве ВКЛ быў прыняты германскі лік сваяцтва[261], які базуецца на сваяцкай групе, асобы якой ствараюць пакаленні, і лік вядзецца па пакаленнях. Два родныя браты знаходзяцца ў першай ступені сваяцтва, стрыечныя браты ў – другой і г.д. Гэты лік выкарыстоўваўся каталіцкім касцёлам пачынаючы, з XI ст., а да таго ўжываўся рымскі лік, па якім асоба знаходзілася з бацькамі ў першай ступені сваяцтва, а з родным братам (сястрой) – у другой[262]. І ў праваслаўных, і ў католікаў былі забаронены шлюбы паміж сваякамі. У некаторых выпадках каталікі маглі атрымаць дазвол на шлюб са сваякамі. Як адзначае А. Лявіцкі, шлюбы паміж сваякамі мелі месца ў праваслаўным асяроддзі і пасля Статута 1566 г.[263] Паводле класіфікацыі крымінальных спраў па соймавай пастанове 1611 г. шлюб паміж сваякамі разглядаўся як прыватная крымінальная

[257] *Спасович В.Д.* Об отношениях супругов. – С. 157; *Лаппо И.И.* Литовский Статут 1588 г. Т. 1. Исследование. Ч. 2. – Каунас, 1936. – С. 37–38; *Таўталес А.* Права сямейнае. – С. 997;

[258] У выданні Статута 1619 г. змешчаны ўнутраныя спасылкі на Р. 3. Арт. 31, 32, 34; Р. 5. Арт. 11, 22. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1619 // Biblioteka Narodowa XVII.4.3228. – S. (194). Выданне 1648 г. утрымлівае спасылкі на тыя ж самыя артыкулы, за выключэннем двух, – 32 і 34. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1648. – S. 199.

[259] *Лаппо И.И.* Литовский Статут 1588 г. Т. 1. Исследование. Ч. 2. – Каунас, 1936. – С. 38–39; *Andriulis V.* Lietuvos Statutų. – P. 47–48.

[260] *Малиновский И.* Учение о преступлении. – С. 59–60; *Таўталес А.* Права сямейнае. – С. 991–992.

[261] *Дзербіна Г.* Права і сям’я эпохі Рэнесансу. – Мн., 1997. – С. 106.

[262] *Goody J.* The Development of the Family and Marriage in Europe. Cambridge, 1983. – P. 134–139.

[263] *Левицький О.* Сім’я і побут українців у XVI ст. – С. 218–219.

справа[264]. Выданне Статута 1619 г. побач з артыкулам змяшчае гравюру з сістэмай сваяцтва. Але яна захавалася не ва ўсіх экзэмплярах[265].

У гэтым жа артыкуле забараняўся бігамны шлюб. Мужчына, які меў венчаную жонку і ажаніўся з другой жанчынай без скасавання папярэдняга шлюбу, падлягаў смяротнаму пакаранню[266]. Калі жанчына ведала аб гэтым факце, то яна таксама каралася. Гэтая норма была непасрэдна звязана з кананічным правам. Для ўсіх хрысціянскіх плыняў знаходжанне ў шлюбе лічылася абсалютнай перашкодай для новага шлюбу[267].

Са Статута 1566 г. у лік заганных і забароненых траплялі дашлюбныя і пазашлюбныя сексуальныя зносіны. Пакаранне ўводзіліся толькі для прадстаўніц жаночага полу. Дзяўчына пазбаўлялася спадчыны, адпаведна і пасагу, калі вяла распусны лад жыцця і не хацела выходзіць замуж (Статут 1566 г. Р. 8. Арт. 7; Статут 1588 г. Р. 8. Арт. 7)[268].

У іншым артыкуле дадавалася, што за паводзінамі дзяўчыны павінны сачыць бацькі ці сваякі па лініі. Калі шляхцянка вяла распусны лад жыцця, то кроўныя мелі права ініцыяваць супраць яе справу. Яе маглі трактаваць як пралюбадзейку і пакараць смерцю (Статут 1588. Р. 14. Арт. 30)[269]. Такія санкцыі не ўжываліся адносна мужчын. Пытанні маралі былі актуальнай праблемай для ВКЛ у XVI ст.[270], і ўвядзенне пэўных нормаў у заканадаўства стала неабходнасцю.

У Статут 1588 г. дадаліся іншыя артыкулы супраць амаральных паводзін, каб «*злости, абы ся в панствах наших християнских не множила*». Пакаранне «горлам» прызначалася за пералюб абаім – мужчыну і жанчыне[271]. Аб здрадзе на «гарачым учынку» маглі сведчыць пабочныя асобы, чэлядзь і слугі. Пры выяўленні злачынства абвяшчалася аб ім суседзям і вінаватыя выклікаліся ў гродскі суд. Калі каханак забіваў мужа, то пазбаўляўся шляхецкага гонару і жыцця, а з яго маёнтка выплачвалася галаўшчызна. Жанчыне таксама пры-

---

[264] Volumina legum. T. III. – S. 36.

[265] У рукапісных каментарах адзначаны артыкулы, якія былі звязаны з 22 артыкулам: Р. 3. Арт. 28; Р. 5. Арт. 20; Р. 14. Арт. 29, 30 і соймавыя канстытуцыі 1573 і 1578 гг. аб шлюбе каралёў. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. Wilna, 1619 // Biblioteka Narodowa XVII.4.3228. – S. (194).

[266] *Малиновский И.* Учение о преступлении. – С. 60; *Andriulis V.* Lietuvos Statutų. – P. 50–51.

[267] *Цыпин В.А.* Церковное право. – М., 1996. – С. 443, 449–453; Dokumenty Soborów powszechnych. Tekst łaciński, polski. T. 4 (1511–1870); *Laretan V, Tryden, Watykan I.* Układ i opracowanie ks. A. Baron, ks. H. Pietros. – Kraków, 2005. – S. 715–733; *Krasiński A.S.* Prawo kanoniczne. – Wilno, 1861. – S. 231–272.

[268] Выданні Статута 1619 і 1648 гг. утрымліваюць аднолькавую спасылку на Р. 14. Арт. 30. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1648. – S. 236.

[269] *Czacki T.* O litewskich i polskich prawach. – S. 23–24; *Малиновский И.А.* Учение о преступлении. – С. 57–58; *Максимейко Н.* Источники уголовных законов. – С. 166; *Пичета В.И.* Земельное право. – С. 476.

[270] *Сліж Н.* Мараль і норавы вялікага князя і шляхты ў эпоху Жыгімонта Аўгуста // Ягелоны: дынастыя, эпоха, спадчына. Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, Гальшаны, Навагрудак, 2006). – Мінск, 2007. – С. 207–216.

[271] *Малиновский И.* Учение о преступлении. – С. 60–61.

суджалася смяротнае пакаранне (Статут 1588. Р. 14. Арт. 30)[272]. Пры чым традыцыйна разглядаўся выпадак жаночай здрады. Гэта было ўласціва для патрыярхальнага грамадства. Такое стаўленне да пералюбу мела месца ў візантыйскім праве і было перанята намі праз Статут Яраслава[273]. Існуе меркаванне, што пакаранне за гэта злачынства было запазычана з Люстра Саксаў[274]. Сапраўды, паводле заканадаўчых нормаў, якія дзейнічалі ў Нямеччыне, пералюб лічыўся жаночым злачынствам. Муж меў права забіць абаіх, і за гэта не было пакарання[275]. Паводле класіфікацыі крымінальных спраў па соймавай пастанове 1611 г., пералюб быў аднесены да віду прыватнай крымінальнай справы. Калі не патрабаваліся сведкі, то выпадак маглі разгледзіць у духоўным судзе[276]. Выкананне гэтых нормаў у судовым справаводстве выявіць дастаткова складана[277]. Прадстаўнікі вышэйшага грамадства часам імкнуліся справы пра пералюб не прадстаўляць у судзе. Асуджэнні за здраду мелі месца ў магістрацкіх судах[278].

Пакаранне смерцю прызначалася распуснай жанчыне, якая нарадзіла дзіцё, а пасля яго забіла з прычыны сораму ці страху пакарання. Разгляд такога злачынства праводзіўся ў гродскім судзе ці гарадскімі ўладамі (Статут 1588. Р. 11. Арт. 60)[279]. Па магдэбургскім праве за гэта злачынства жанчыну закапвалі жыўцом ці тапілі[280]. Пачынаючы з увядзення Статута Яраслава, жанчына, якая нарадзіла пазашлюбнае дзіцё, падлягала пакаранню і асуджэнню[281]. Негатыўнае стаўленне да рапусных жанчын і іх дзяцей моцна ўкаранілася ў грамадскай свядомасці, што правакавала злачынствы. Рэакцыя была адпаведная – увядзенне пакаранняў.

Упершыню ў Статуце 1588 г. было ўведзена пакаранне зводнікам абодвух полаў за намаўленне займацца прастытуцыяй замужніх і незамужніх жанчын. Адказнасць за выкананне артыкула ўскладалася на ваяводаў, старостаў і гарадскі ўрад. За гэтае злачынства каралі адразаннем носа, вушэй і вуснаў. За паўторнае правапарушэнне прызначалася смяротнае пакаранне (Статут 1588. Р. 14.

---

[272] У выданні 1619 г. не захаваліся старонкі, дзе былі змешчаны каментары. А выданне 1648 г. спасылалася на Р. 11. Арт. 12; Р. 5. Арт. 22; Р. 11. Арт. 19; Р. 14. Арт. 3. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1648. – S. 359.

[273] «Книги законные». С. 68, 69, 72, 73, 75; *Щапов Я.П.* Княжеские уставы. – С. 243–255; Российское законодательство X–XX вв. – Т. 1. – Москва, 1984. – С. 197–198, 207–208.

[274] *Максимейко Н.* Источники уголовных законов. – С. 166.

[275] *Brudage J.A.* Law, Sex, and Christian Society. – P. 132.

[276] Volumina legum. – T. III. – S. 36.

[277] Ян Скурка атрымаў вызваленне ад смяротнага пакарання за пералюб з Гальшкай. Дзякуючы спрыянню луцкага епіскапа і луцкіх ураднікаў, яе муж, луцкі бальвер Каспар злітасціваўся і прабачыў здраду (1582). Архив ЮЗР. – Ч. 8. Т. 3. – К., 1909. – С. 334–336.

[278] Войтаўска-лаўніцкі суд Гародні асудзіў на смерць гарадзенскую мяшчанку Раіну, дачку гарадзенскага ката Марціна Загурскага, за пералюб з гарадзенскім жыдам Шымкам Хаімовічам (1668). Іх неаднаразова бачылі гараждане падчас сексуальных адносінаў у розных месцах, у тым ліку ва ўладаннях гарадзенскага касцёла Св. Мікалая. Раіна была замужам за хрысціянінам, а здраджвала з «няверным жыдам». НГАБ. – Ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 164 адв.–165.

[279] Выданне Статута 1648 г. спасылаецца на Р. 14. Арт. 29. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1648. – S. 313.

[280] *Максимейко Н.* Источники уголовных законов. – С. 167, 174.

[281] Древнерусские княжеские уставы XI–XV вв. – С. 104.

Арт. 31[282])[283]. Падобным чынам (адразаннем носа) караліся пралюбадзеі, кроваzмяшальнікі, асобы, якія мелі сексуальныя стасункі з духоўнымі асобамі па візантыйскім праве[284] і па магдэбургскім праве[285]. Іншыя нямецкія зводы законаў таксама прадугледжвалі фізічнае пакаранне за прастытуцыю. Для Нямеччыны гэта была актуальная праблема, бо кантынгент прастытутак значна папаўняўся з ліку славянак і фінак, якія здабываліся падчас вайсковых экспедыцый[286]. Прымяненне метадаў фізічнага пакарання мела на мэце вылучыць асобу ад іншых, паказаць праз фізічныя пашкоджанні яе прыніжаны статус у грамадстве.

Пры характарыстыцы «непрыстойных» жанчын у заканадаўстве выкарыстоўваўся тэрмін «*вшетечница*», жанчына, якая «*у стане своемъ неучстиве се ховати мела*», што азначала *распусніца.* Так называлі жанчыну, якая прафесійна займалася прастытуцыяй, таксама і жанчыну, якая вяла распусны лад жыцця. Паняцце «*вшетечность*»[287] азначала *распуста.* Тэрміны сустракаюцца ў артыкулах пра абразу жанчыны (Статут 1588. Р. 3. Арт. 28)[288], адмаўленне бацькі ад дачкі (прыводзіла да адхілення дзяўчыны ад спадчыны), забойства немаўля, пералюб. Слова *прастытуцыя* не ўжывалася ў старабеларускай мове. У артыкуле пра зводніцтва ўжываецца паняцце «*спросность телесное*». З артыкула аб пералюбе відавочна, што гэта мае дачыненне да распусты. Са згаданых нормаў права вынікае, што жанчыны займаліся прастытуцыяй, распусна паводзілі, намаўлялі іншых жанчын стаць прастытуткамі. Мужчына прадстаўляўся ў ролі арганізатара гандлю жанчынамі ці пралюбадзея[289]. Традыцыйна найперш абвінавачвалася жанчына, а не кліені-мужчына, які ствараў попыт на сексуальныя паслугі.

Праз згаданыя нормы права было вызначана, што законнымі з’яўляюцца сексуальныя зносіны толькі ў шлюбе. Да забароненых адносіліся пералюб, прастытуцыя, распусны лад жыцця, згвалтаванне. Пражыванне мужчыны і жанчыны без вянчанне мела наступствы толькі для іх дзяцей.

Многія артыкулы Статута 1566 г. сталі асновай для рэгулявання сямейна-шлюбных адносін у Статуце 1588 г. Ад папярэдніх зводаў законаў Статут 1588 г. адрозніваўся больш жорсткім кантролем сямейна-шлюбных стасункаў. З’явіліся артыкулы, якія ўмешваліся ў сферу маралі і нораваў, а многія артыкулы па шлюбе былі дапрацаваны. Былі палажэнні, якія засталіся нязменнымі ў трох

---

282 У выданні Статута 1648 г. падаецца спасылка на Р. 3. Арт. 22. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. – Wilna, 1648. – S. 360.

283 *Малиновский И.* Учение о преступлении. – С. 58.

284 «Книги законные». – С. 68, 69, 72, 73, 75.

285 *Максимейко Н.* Источники уголовных законов. – С. 166–167, 172–173.

286 *Brudage J.A.* Law, Sex, and Christian Society. – P. 133.

287 Слова *вшетечность* паходзіць з польскай мовы *wszeteczeństwo* (распуста).

288 Артыкул пра абразу жанчыны паходзіць з візантыйскага права. Ён быў уключаны ў Статут Яраслава, але там выкарыстоўваўся тэрмін «блядь». Древнерусские княжеские уставы XI–XV вв. – С. 105.

289 Статут 1588. Р. 3. Арт. 28; Р. 8. Арт. 7; Р. 11. Арт. 60; Р. 14. Арт. 30, 31; *Малиновский И.* Учение о преступлении. – С. 57–60, 111.

Статутах: вена на 1/3 маёмасці[290], пасаг з 1/4 маёмасці[291], забарона выдаваць замуж без дазволу бацькоў[292] і прымушэнне ўступаць у шлюб[293].

Для ўсталявання і замацавання нормаў па шлюбных і пазашлюбных стасунках вышэйшага грамадства ВКЛ спатрэбіўся доўгі перыяд. Асновы былі закладзены звычаёвым правам, агульназемскімі і земскімі прывілеямі, судовай практыкай. Меў месца ўплыў візантыйскага, рымскага, польскага права. Значную ролю адыграла праваслаўнае кананічнае права, якое ўнесла прынцыпы шлюбных стасунках у звычаёвае права.

Заканадаўства еўрапейскіх краін разглядала шлюб праз пасаг і вена, як важныя элементы маёмасных дачыненняў[294]. Статуты ВКЛ таксама надавалі ўвагу гэтаму аспекту. Яны зыходзілі з інтарэсаў патрыярхальнага грамадства. Заканадаўства выразна абумовіла памеры пасагу і вена, умовы складання вяноўнага запісу, пакаранні на выпадак парушэння нормаў і інш. Гэта азначала, што маёмасны бок адносінаў паміж мужчынам і жанчынай, а часам і маральны, пераходзіў пад кантроль дзяржавы. Пры гэтым большасць артыкулаў разглядала шлюб як свецкі інстытут.

Асноўнай каштоўнасцю для шляхты была нерухомая маёмасць, якая перадавалася па мужчынскай лініі. Зыходзячы з гэтага, у заканадаўстве былі прыняты нормы, якія адмыслова стваралі сітуацыю гендэрнай няроўнасці ў шлюбных злучэннях. Дзяўчына атрымлівала пасаг у рухомых рэчах, за гэта ёй прызначалася ад мужа забеспячэнне (вена) у грошах. Заканадаўствам прадугледжваліся выпадкі, калі жанчына магла атрымаць нерухомую маёмасць, але яна ішла спадчынніцай другой чаргі. Для шляхцянкі патрабаваўся дазвол на шлюб і дэкляраванне яе згоды. У дачыненні да шляхціча гэтыя артыкулы не выкарыстоўваліся. Ён не пазбаўляўся спадчыны, калі жаніўся без згоды бацькоў ці апекуноў. У Статутах не абумоўліваўся выпадак шлюбу праз гвалт адносна мужчыны. Таксама не караўся мужчына за распуснае жыццё і нежаданне жаніцца да 25 год, як гэта прадугледжвалі Статуты 1566 і 1588 гг. для жанчыны вышэйшага саслоўя. Шляхціч мог ажаніцца з жанчынай любога саслоўя і такім чынам надаць шляхецтва жонцы і дзецям, якія нараджаліся ў гэтым шлюбе. Шляхцянка ў выпадку няроўнага шлюбу цярпела страты ў статусе і маёмасці. Пры параўнанні правоў і абавязкаў мужчыны і жанчыны пры заключэнні шлюбу, відавочны дыскрымінуючы характар заканадаўства адносна прадстаўніц жаночага полу, што адпавядала эпосе і патрыярхальнаму ладу.

Заканадаўства абараняла сямейную маёмасць ад неадпаведных паводзінаў нашчадкаў. У асноўным гэта мела дачыненне да асобаў жаночага полу. Калі асоба паводзіла сябе не па статусе, то яна не магла паўнапраўна распараджацца

---

[290] У Статуце 1529 г. вена дакладна не вызначана, ёсць толькі ў пашыранай версіі. Статут 1529. Р. 4. Арт.1; Статут 1566. Р. 5. Арт. 2, 3; Статут 1588. Р. 5. Арт. 1, 2.

[291] Статут 1529. Р. 4. Арт. 7; Статут 1566. Р. 5. Арт. 1; Статут 1588. Р. 5. Арт. 2, 3.

[292] Статут 1529. Р. 4. Арт. 10; Статут 1566. Р. 5. Арт. 7; Статут 1588. Р. 5. Арт. 8, 9.

[293] Статут 1529. Р. 4. Арт. 10; Статут 1566. Р. 3. Арт. 31; Статут 1588. Р. 3. Арт. 39.

[294] *Ланге О.* О правах собственности супругов. – С. 27–35, 47; *McNamara Jo A., Wemple S.* The power of Women. – P. 83–97; *Spring E.* Law, Land and Family. Aristocratic Inheritance in England, 1300–1800. USA, 1993. – P. 39.

маёмасцю: як гэта належыць. Яе ці пазбаўлялі маёмасці, ці істотна абмяжоўвалі ў маёмасных правах. Статуты ВКЛ паступова ўмешваліся ў сексуальную сферу жыцця шляхты. Напачатку закраналіся дашлюбныя і пазашлюбныя адносіны, вынікам якіх былі незаконнанароджаныя дзеці. Пры гэтым не забаранялася мець такія адносіны без наступстваў, без дзяцей. Яны сталі падлягаць пакаранню пазней.

У Статутах падкрэслена каштоўнасць сям'і і шлюбу, замацавана паняцце законнасці шлюбу, абаронена правам яго трываласць. Такім чынам, была паказана важнасць інстытута шляхецкай сям'і для дзяржавы і асноўныя накірункі палітыкі адносна сям'і.

Нормы па шлюбных дачыненнях фарміраваліся ў кантэксце сямейнага права ВКЛ. Традыцыі і звычаі ў сямейнай сферы былі ўсталяваны паступова і не мяняліся кардынальна. Статут 1529 г. замацаваў традыцыі і звычаі, якія склаліся на той час, улічыў судовую практыку. Ён стаў асноўным дакументам, якім кіраваліся суды. Пры гэтым сустракаліся выпадкі, якія паказвалі на неабходнасць далейшай дапрацоўкі заканадаўства. Таму Статут 1566 г. меў больш артыкулаў, прысвечаных шлюбу. Ён адыграў значную ролю ў развіцці сямейнага права ВКЛ. Яго артыкулы з некаторымі зменамі ўвайшлі ў Статут 1588 г. Кадыфікацыя гэтай галіны права адбывалася ў рэчышчы ўсяго заканадаўства, але са сваімі адметнасцямі. Калі паміж Статутамі 1529 г. і 1566 г. адчуваецца істотная якасная розніца, то паміж Статутамі 1566 г. і 1588 г. яна значна меншая. У апошнім зводзе назіраецца пашырэнне фармулёвак і дапрацоўка тэкстаў артыкулаў[295]. Такім чынам, у другой палове XVI ст. закончылася афармленне нормаў па шлюбных стасунках. Нevялікія змены і ўдакладненні ўносіліся соймавымі канстытуцыямі ў XVI–XVII стст.

[295] *Bardach J.* Statuty litewskie jako wyraz kultury prawnej. – S. 315.




Сістэма сваяцтва. З перавыдання Статута 1588 г. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. Wilna, 1619. Biblioteka Narodowa. XVII.4.1719.



Каментары да артыкулаў 5 раздзела Статута 1588 г. Statut Wielkiego Xięstwa Litewskiego. Wilna, 1619. Biblioteka Narodowa XVII.4.3228.

# РЕЗЮМЕ

*Наталя Сліж*

## ШЛЮБНІ ТА ПОЗАШЛЮБНІ СТОСУНКИ ШЛЯХТИ У ЗВИЧАЄВОМУ ПРАВІ І ЗАКОНОДАВЧИХ АКТАХ ВКЛ

Стаття присвячена регулюванню шлюбних та позашлюбних стосунків шляхти Великого князівства Литовского у законодавчих актах. Дослідження складається з двох частин: інститут шлюбу в період до прийняття Статуту 1529 р. і регулювання шлюбних стосунків Статутами 1529, 1566, 1588 рр. Аналізуються звичаєве право та його джерела, грамоти великих князів литовських, особливості формування артикулів стосовно шлюбу в трьох редакціях Статуту. Відзначається, що основний процес оформлення юридичних норм закінчився в другій половині XVI ст. Сеймові конституції надалі вносили несуттєві зміни.

***Ключові слова:*** звичаєве право, законодавство Великого князівства Литовського, шляхетський шлюб.

*Наталья Слиж*

## БРАЧНЫЕ И ВНЕБРАЧНЫЕ ОТНОШЕНИЯ ШЛЯХТЫ В ОБЫЧНОМ ПРАВЕ И ЗАКОНОДАТЕЛЬНЫХ АКТАХ ВКЛ

Статья посвещена регулированию брачных отношений и отношений вне брака шляхты Великого Княжества Литовского в законодательных актах. Исследование состоит из двух частей: институт брака в период до принятия Статута 1529 г. и регулирование брачных отношений Статутами 1529, 1566, 1588 гг. Анализируются обычное право и его источники, грамоты великих князей литовских, особенности формирования статей по браку в трёх редакциях Статутов. Отмечается, что основной процесс оформления юридических норм закончился во второй половине XVI в. Сеймовые конституции в дальнейшем вносили несущественные изменения.

***Ключевые слова:*** обычное право, законодательство Великого княжества Литовского, шляхетский брак.

*Natallia Slizh*

## MARITAL AND EXTRAMARITAL RELATIONS IN THE GENTRY MILIEU ACCORDING TO COMMON LAW AND LEGISLATIVE ACTS OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA

The article is devoted to regulation of marriage and extramarital relations of the nobility of the Grand Duchy of Lithuania in legistation. It concists of two parts: marriage institute in the period before the Statute of 1529 and regulation of marriage relations by Statutes of 1529, 1566, and 1588. The reseach analizes commanary law and its sources, grand duke's privileges, and speciality of forming articles related to marriage in three Statutes. The attention is paid that legal norms finished their forming at the second half of the sixteenth century. Sejm constitiotions imput inessential changes.

***Keywords:*** customary law, legislation of the GDL, noble marriage.